ЯК ПАВЯРНУЦЬ ЛЮДЗЕЙ ТВАРАМ ДА ВЁСКІ? 5





КАМПАРТЫЯ КІТАЯ Ў АВАНГАРДЗЕ РЭФОРМАЎ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
6 ЛІСТАПАДА 2024 г.
СЕРАДА
№ 217 (30351)
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## АРЫЕНЦІРЫ НАШАГА ШЛЯХУ

***Дарагія суайчыннікі!***

*Шчыра віншую вас з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.*

*Падзеі восені 1917 года прымусілі свет пачуць голас народа, які смела і адкрыта заявіў аб сваёй шматвяковай мары. Аб'яўленне аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі стала сапраўдны трыумфам гістарычнай справядлівасці.*

*Невычэрпная любоў да Радзімы, працавітасць і адзінства дапамаглі нашым продкам прайсці ўсе выпрабаванні і абараніць права свабодна жыць на роднай зямлі.*

*Выбраўшы ў XXI стагоддзі самастойны шлях, мы захоўваем нязменныя арыенціры савецкай эпохі: ад ідэалаў сацыяльнай роўнасці і гуманізму да каштоўнасцяў міру і сяброўства народаў. Аберагаючы дасягнутае папярэднікамі, натхняючыся іх подзвігамі, упэўнена пішам новую старонку ў тысячагадовым летапісе беларускага народа.*

*Дарагія таварышы, у гэты знамянальны дзень жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў ва ўсіх пачынаннях.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА

Адкрываць новыя грамадскія і сацыяльна-культурныя аб'екты напярэдадні дзяржаўных свят стала добрай традыцыяй у нашай краіне. Такія падарункі не толькі істотна паляпшаюць якасць жыцця людзей, але і нясуць ім сапраўдную радасць.

Такую, якую прынесла жыхарам Асіповічаў адкрыццё новай школы.

Шматфункцыянальнаму комплексу радуюцца ўсе: і дарослыя, і асабліва дзеці, для якіх створаны ўсе ўмовы для вучобы і развіцця: тут ёсць музей, бібліятэка, актавая зала, а таксама спартыўныя і трэнажорныя залы, пляцоўкі вакол школы.

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## «БУДЗЕМ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ТАК, ЯК ГЭТА ПАТРЭБНА НАШАЙ КРАІНЕ І НАШАМУ НАРОДУ»

### Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях правядзення выбараў 2025 года

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта традыцыйнае мерапрыемства на старце выбарчай кампаніі. Пастаўлена задача — правесці яе на высокім узроўні. Перш за ўсё арганізацыйным.**

**«Як я кажу, зрабіць (хоць мы і для свайго народа гэта праводзім) так, каб камар носа не падтачыў, — канкрэтызаваў сваё даручэнне Аляксандр Лукашэнка. — Але пры гэтым памятаць: мы праводзім у Беларусі перадвыбарную кампанію для свайго народа, і інтарэсы нашых людзей павінны быць пастаўлены ў аснову асноў. А не так, як хтосьці хоча там, за мяжой».**

#### «НЕ ТРЭБА РАССЛАБЛЯЦЦА»

Найперш, па словах кіраўніка дзяржавы, неабходна стварыць належныя ўмовы для кандыдатаў і выбарчых камісій, падрыхтаваць выбарчыя ўчасткі. У прыватнасці, Прэзідэнт пераканаўча папрасіў звярнуць увагу на скрыні, куды выбаршчыкі апускаюць бюлетэні. «Калі трэба, давайце ўжо нейкія стандартныя або па абласцях стандарт установім і зробім прыгожыя, нармальныя, каб не было непрыемна, — прапанаваў ён, кажучы і аб стацыянарных, і аб пераносных скрынях. — Трэба, каб яны хаця б глядзеліся нармальна».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ з савецкіх часоў у Беларусі прынята, што выбары — гэта свята. «Хто б нас ні крытыкаваў, людзі прыходзяць на выбары, яны прызвычаіліся да таго, што недзе буфет, музыка іграе і гэтак далей, — канстатаваў ён. — Натуральна, гэта сфера адказнасці перш за ўсё нашых мясцовых органаў улады».

Кажучы аб правакацыях у перадвыбарны перыяд (у тым ліку інфармацыйных і палітычных), беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што яны былі, ёсць і будуць. «Проста не трэба расслабляцца, — папярэдзіў ён і працытаваў некаторых спікераў: — «Ах, у нас грамадства такое, гэтыя адмарожаныя самыя, яны збеглі» і іншае. Хапае ў грамадстве розных людзей. І расслабляцца тут нікому ні ў якім разе не трэба. Асабліва нам, органам улады на месцах. Трэба зыходзіць з горшага варыянта. Будзе лепшы, ну і добра».

У выпадку пэўных небяспечных тэндэнцый у грамадстве, па словах кіраўніка дзяржавы, кіраўнікі рэгіёнаў будуць праінфармаваны.

СТАР. 2

КОРАТКА

- **Галоўчанка: заснавана медыякампанія Саюзнай дзяржавы.**
- Каля 7 тысяч людзей, старэйшых за 90 гадоў, жывуць у Мінску.
- **Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі адкрылі ў Пружанскай райбальніцы.**

ISSN 1990 — 763X
24217>
9 771990 763008

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## ЯК ГРЭЦЦА, КАБ НЕ ЗАГАРЭЦЦА?



Фота Лізаветы ГОЛАД.

### Разам з МНС разбіраемся ў нюансах пячнога ацяплення

**Печ — адзін з найважнейшых атрыбутаў прыватнага дома. Без яе немагчыма ўявіць утульную дачу або дом у ціхай вёсцы. Але яе, як і ўсе складаныя і важныя рэчы, таксама трэба ўмець выкарыстоўваць. Абыякавасць можа прывесці да самых сур'ёзных наступстваў. Як сагрэцца ў халодную пару і пазбегнуць трагедыі? Што неабходна зрабіць, каб павысіць бяспеку ў доме ў ацяпляльны сезон? Карэспандэнты «Звязды» пашукалі адказы на гэтыя пытанні разам з намеснікам начальніка Смалявіцкага РАНС падпалкоўнікам унутранай службы Сяргеем ТАРАСЕВІЧАМ, арганізаваўшы рэйд па населеных пунктах Смалявіцкага раёна.**

СТАР. 4

# «БУДЗЕМ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ТАК, ЯК ГЭТА ПАТРЭБНА НАШАЙ КРАІНЕ І НАШАМУ НАРОДУ»

## «ГАЛОЎНАЕ, КАБ МЫ БЫЛІ АРГАНІЗАВАНЫЯ»

Кажучы аб спробах разгайдаць сітуацыю ў Беларусі, Прэзідэнт заўважыў, што некаторыя гавораць, што «яны да 2030 года там рыхтуюцца, а гэты год...» «Зразумела, яны могуць гаварыць адно, а прымаць іншыя меры, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Яны ўжо выпрацоўваюць планы, як ім дзейнічаць. Праўда, у асноўным градус напружання ствараецца за межамі краіны. Яны разабраўца там не могуць, якую тактыку ім выпрацаваць. Думаю, падкажуць. Там жа «разумных» шмат навокал. І грошы дадуць на гэта».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што проста так гаварыць нешта ў сродках масавай інфармацыі прайшоў час. Апаненты ўлады, па яго словах, гэта разумеюць, таму гатовы і да радыкальных дзеянняў. «Значыць, і мы ў адказ павінны быць гатовы рабіць адэкватныя дзеянні», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён канстатаваў, што грамадства ў Беларусі адзінае, эканоміка дэманструе нядрэнныя вынікі. «Але вымушаны вам сказаць, што будучая пяцігодка будзе няпростай, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Няпростая пяцігодка. І, можа быць, нават наступны год. Я заўсёды спрабую зберагчы грамадства ад нейкіх размоў пра санкцыі, але іх жа ніхто не адмяняў».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што больш душылі санкцыямі Расію. Але дасталася і нашай краіне — каб Расія не магла праз нас абысці санкцыйныя абмежаванні. «Вядома, гэтыя санкцыі так ці інакш уплываюць на эканоміку, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Так, мы лагістыку выбудавалі, мы знайшлі ў асноўным шляхі пастаўкі нашых тавараў, але кошт вырас гэтых лагістычных паставак. Таму прадпрыемствы значна былі б багацейшымі, калі б не было гэтых перашкод». Але адпаведныя выхады з гэтага, як запэўніў кіраўнік дзяржавы, будуць знойдзены.

«Галоўнае, каб мы былі арганізаваныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і нагадаў, што нядаўна на гэтую тэму размаўляў са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Каранікам, калі быў у рэгіёне. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы папрасіў не забываць, што гэта найлепшая вобласць, а такіх праблем «у квадраце» хапае ў іншых рэгіёнах, асабліва ўсходніх. На гэта, па яго словах, таксама трэба звяртаць увагу.

Прэзідэнт канстатаваў, што галоўнай дзеючай асобай у выбарчы перыяд, як заўсёды, з'яўляецца старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі, якому трэба аказаць неабходную дапамогу і падтрымку. Аляксандр Лукашэнка папрасіў арыентавацца на Ігара Карпенку.

«Усё, што ён папросіць, мы павінны дапамагчы, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Але там, дзе не трэба ўмешвацца, не трэба крычаць і бегчы наперадзе паравоза. У гэтым няма ніякай неабходнасці. Менш будуць нас папракаць фактычна, што мы там умешваемся ў якіясьці выбары. Але ўсе павінны разумець, што мы ўжо спрактыкаваліся за гэтыя гады і разумеем, што ўладу растапыранымі рукамі не трымаюць. І мы не збіраемся гэта рабіць. Мы выснову з 2020 года зрабілі, таму будзем дзейнічаць так, як гэта патрэбна нашай краіне і нашаму народу».

Вераніка КАНЮТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

У размове з супрацоўнікамі СМІ **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА** адзначыў, што выбарчая кампанія 2025 года ўступіла ў актыўную фазу. «Дастаткова актыўна ішла рэгістрацыя ініцыятыўных груп, — канкрэтызаваў ён. — У агульнай складанасці дакументы (хтосьці асноўны пакет, хтосьці — часткова) у ЦВК падавала 11 прэтэндэнтаў. Чацвярым мы адмовілі: з-за недахопу адпаведных дакументаў. У выніку сёння зарэгістравана сем ініцыятыўных груп». Інфармацыя аб гэтых ініцыятыўных групах у найбліжэйшы час з'явіцца на сайце Цэнтрвыбаркама.

Ігар Карпенка паведаміў, што 7 лістапада стартуе этап збору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты, чым акурат і будуць займацца члены ініцыятыўных груп. Не выключана, што сітуацыя могуць скарыстацца ашуканцы. Старшыня ЦВК паведаміў, як не пераблытаць іх з рэальнымі зборшчыкамі подпісаў.

«Па-першае, мы па ініцыятыўных групах дадзім інфармацыю, у тым ліку і кантактныя даныя, — канкрэтызаваў Ігар Карпенка. — Па-другое, у зборшчыка подпісаў павінна быць пасведчанне, якое падпісана старшынёй ЦВК і на якім стаіць пячатка Цэнтральнай выбарчай камісіі. Яно павінна быць заламінавана. Гэта пасведчанне без фатаграфіі. Таму яно сапраўднае толькі пры прад'яўленні дакумента, які сведчыць асобу». Удакладніць інфармацыю аб членах ініцыятыўных груп можна будзе і ў сваёй тэрытарыяльнай выбарчай камісіі.

Традыцыйна на прэзідэнцкія выбары будуць запрашацца міжнародныя назіральнікі. Як нагадаў старшыня Цэнтрвыбаркама, згодна з заканадаўствам, паўнамоцтвы запрашаць міжнародных назіральнікаў ёсць у Прэзідэнта, Усебеларускага народнага сходу, абедзвюх палат парламента, урада, Міністэрства замежных спраў і Цэнтральнай выбарчай камісіі.

«Са свайго боку Цэнтральная выбарчая камісія ўжо накіравала запрашэнні старшыням Цэнтральных выбарчых камісій краін СНД і іх дэлегацыям для ўдзелу ў назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі ў 2025 годзе, — канкрэтызаваў Ігар Карпенка. — Гэта выбарчыя камісіі, з якімі ЦВК Беларусі актыўна працуе ў рамках Кансультатыўнага савета кіраўнікоў выбарчых органаў краін СНД, у якім Беларусь цяпер старшынстве. У перыяд іх удзелу ў назіранні мы плануем правесці чарговае пасяджэнне Кансультатыўнага савета кіраўнікоў выбарчых органаў».

Акрамя таго, для назірання за выбарамі плануецца запрасіць місіі СНД, ШАС, іншых міжнародных арганізацый. Таксама будзе разгледжана магчымасць запрашэння назіральнікаў ад шэрагу такіх міжнародных арганізацый, як Арганізацыя ісламскага супрацоўніцтва, Арганізацыя цюркскіх дзяржаў, Рух недалучэння, Ліга арабскіх дзяржаў, Панафрыканскі парламент. МЗС і ЦВК таксама даручана прапрацаваць пытанне запрашэння прадстаўнікоў іншых міжнародных структур.

«Любая выбарчая кампанія — гэта справа дзяржаўнай важнасці, — рэзюмуючы, падкрэсліў Ігар Карпенка. — І ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, у кожнага органа дзяржаўнай улады, у кожнага суб'екта ёсць свае паўнамоцтвы. Наша задача — аднолькава прымяняць выбарчае заканадаўства».

У мясцовых органаў улады, праваахоўнікаў, па яго словах, — свае функцыі: добраўпарадкаванне месцаў галасавання, забеспячэнне правапарадку і г. д. «Гэта комплексныя пытанні для таго, каб мы выбары правялі арганізавана, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, стварылі ўсе ўмовы для таго, каб нашы грамадзяне маглі прыйсці свабодна на ўчасткі (хто датэрмінова, хто — у асноўны дзень галасавання) і ажыццявіць сваё волевыяўленне», — падкрэсліў ён.

# «Мы людзі абавязку. І, калі дамаўляемся, свае абавязацельствы выконваем»

## Аляксандр Лукашэнка вызначыў перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва з Тульскай вобласцю

**Вітаючы дэлегацыю расійскага рэгіёна ў Беларусі, Прэзідэнт павіншаваў Дзмітрыя Міляева з выбраннем на гэту, па яго словах, вельмі высокую і адказную пасаду (датэрміновыя выбары губернатара Тульскай вобласці адбыліся ў верасні 2024 года). Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паездка губернатара Тульскай вобласці ў Беларусь з'яўляецца адным з першых крокаў на новай пасадзе. У сувязі з гэтым беларускі лідар выказаў сваё пажаданне, каб яна была выніковай.**

Апошні раз Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з дэлегацыяй Тульскай вобласці ў Мінску больш чым дзесяць гадоў таму. За гэты час, па словах кіраўніка дзяржавы, Беларусь і гэты расійскі рэгіён сур'ёзна рушылі наперад у плане супрацоўніцтва.

«Двухбаковы тавараабарот за мінулыя два гады, нягледзячы ні на якія цяжкасці, а, можа, дзякуючы гэтым цяжкасцям, дасягнуў паказчыка ў паўмільярда долараў, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Гэта даволі вялікія аб'ёмы, улічваючы тое, што за 9 месяцаў бягучага года мы дадалі 37 % — каласальны рост. Таму мільярд долараў — планка не такая ўжо і высокая сёння для нас».

### «Пацвярджаем гатоўнасць да далейшага пашырэння супрацоўніцтва з прамысловымі прадпрыемствамі»

Аляксандр Лукашэнка засяродзіў увагу на шэрагу кірункаў, па якіх Беларусь і Тульская вобласць могуць паглыбіць супрацоўніцтва.

**Першы — вытворчая кааперацыя.** «Акрамя чыстага прыбытку, трансферу тэхналогій, укаранення інавацый і забеспячэння тэхналагічнага суверэнітэту, яна вядзе да стварэння новых працоўных месцаў як у нашай краіне, так і ў вашым рэгіёне», — адзначыў Прэзідэнт. Пры гэтым ён заўважыў, што новыя працоўныя месцы будуць са знакам якасці.

Адпаведны вопыт, як нагадаў беларускі лідар, ужо ёсць: у частцы вытворчасці спецтэхнікі рэалізоўваецца праект паміж Мінскім аўтамабільным заводам і аб'яднаннем «СПЛАВ». «Цікавасць да кааперацыі з беларускімі партнёрамі, у тым ліку па закупках металаканструкцый, праяўляе «Тулажелдормаш», а да прадукцыі гэтага тульскага прадпрыемства — наша Беларуская чыгунка, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Мы таксама пацвярджаем сваю гатоўнасць да далейшага пашырэння супрацоўніцтва з прамысловымі прадпрыемствамі вобласці, якія выпрацоўваюць спецыяльную прадукцыю, — тую, чым вы славіцеся ва ўсім свеце».

**Другі — пастаўкі беларускай тэхнікі.** Прэзідэнт праінфармаваны, што тульскай дэлегацыяй запланавана наведванне Мінскага аўтамабільнага завода. «Упэўнены, тэхніка МАЗ у вас знойдзе шырокае прымяненне, вы яе ведаеце», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт пацвердзіў гатоўнасць удзельнічаць у праектах па мадэрнізацыі парка пасажырскай тэхнікі ў гэтым расійскім рэгіёне. «Перспектыўнай бачыцца рэалізацыя ў вашай вобласці пілотнага праекта па запуску электробусаў і будаўніцтве зарадных станцый, — дадаў ён. — У Беларусі пэўны вопыт ужо ёсць». Аляксандр Лукашэнка прапанаваў паглядзець, як гэта працуе на практыцы.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што, наведваючы ў мінулым годзе выставу «Белагра-2023», тульская дэлегацыя магла азнаёміцца з патэнцыялам беларускай сельскай гаспадаркі, пераканаца ў якасці нашай тэхнікі. «У гэтай сферы нам з вамі адназначна ёсць куды прырастаць (у 2023 годзе прададзена ўсяго 58 адзінак трактароў МТЗ), — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Яны сёння вельмі патрэбны ў любой галіне, як і ў Беларусі. У гэтым кірунку можам з вамі пасупрацоўнічаць».

### «Акажам пры неабходнасці садзейнічанне ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў»

**Трэці — навуковае супрацоўніцтва**, якое, па словах Прэзідэнта, можа стаць вельмі перспектыўнай тэмай узаемных інтарэсаў. «У частцы распрацоўкі і вытворчасці хімічных кампанентаў, кампазітных матэрыялаў можам прапанаваць як узаемадзеянне з Інстытутам хіміі новых матэрыялаў Акадэміі навук Беларусі, так і кааперацыйныя адносіны з прадпрыемствам «Пеленг», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Акажам пры неабходнасці садзейнічанне ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў для гэтай галіны, калі ў вас будзе цікавасць».

**Чацвёрты — сельская гаспадарка.** Прэзідэнт прапанаваў нарошчваць аб'ёмы паставак у Тульскую вобласць беларускіх прадуктаў харчавання, сельскагаспадарчай сыравіны. «Наша найноўшая тэхналагічная вытворчасць — «Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя» — прапаноўвае высакаякасныя камбікармы, прэміксы і амінакіслоты, — дадаў ён. — Прадпрыемства «Белнасенне» валодае неабходнымі рэсурсамі элітнага насення беларускай селекцыі».

Айчынныя прадпрыемствы, як звярнуў увагу беларускі лідар, гатовы ўдзельнічаць і ў праектаванні і будаўніцтве жывёлагадоўчых комплексаў, прытым пад ключ.

**Пяты — будаўніцтва.** Прэзідэнт праінфармаваў, што нашы спецыялісты будуюць шматкватэрныя жылыя дамы ў Калузе, Варонежы, іншых рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. У гэтым плане Беларусь гатова супрацоўнічаць і з Тульскай вобласцю.

**Шосты — сфера жыллёва-камунальнай гаспадаркі**, вопытам работы ў якой Беларусь таксама гатова падзяліцца, уключаючы пытанні водаачысткі, водаадвядзення.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ён агучыў толькі невялікае кола перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва з Тульскай вобласцю, якое, па яго словах, не абмяжоўваецца абазначанымі тэмамі. Ён заўважыў, што падчас перагавораў ва ўрадзе з'явяцца новыя кірункі супрацоўніцтва і пытанні, якія зацікавяць абодва бакі.

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка гарантаваў: тое, аб чым з Беларуссю дамовіцца Тульская вобласць, будзе выканана. «Мы людзі абавязку, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І калі дамаўляемся, свае абавязацельствы выконваем».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што, маючы на ўвазе і наша стратэгічнае развіццё, апора робіцца на дзяржаўныя мерапрыемствы. «Вы разумееце, што дзяржаўныя прадпрыемствы падвяргаюцца яшчэ больш жорсткаму кантролю, — удакладніў ён. — І калі з дзяржпрадпрыемствам дамовіўся, то ўжо можна не турбавацца за нейкія гарантыі. Словам, паглядзіце. Калі вам нешта спадабаецца, мы гатовы адгукнуцца і дапамагаць нашай Тульскай вобласці».

Губернатар Тульскай вобласці Дзмітрый Міляеў адзначыў, што дэлегацыя гэтага расійскага рэгіёна прыязджае ў Беларусь рэгулярна. «Знешнеэканамічныя і культурныя сувязі нашага рэгіёна з Рэспублікай Беларусь вылічваюцца дзесяцігоддзямі, — падкрэсліў ён. — Урад Тульскай вобласці працягвае працаваць па пошуку дастатковых інструментаў і схем узаемадзеяння нашага рэгіёна з рэспублікай. З боку прадпрыемстваў Тульскай вобласці мы бачым узрослую цікавасць да беларускага рынку. Гэта пацвярджаюць паказчыкі знешняга гандлю. Рухаемся ў гэтым кірунку паступальна».

Вераніка КАНЮТА.

Міжнародны вектар

# Па лініі парламенцкай дыпламатыі

## Падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Панафрыканскім парламентам

**Галоўным вынікам візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку стала падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Панафрыканскім парламентам.**

Цырымонія падпісання адбылася ў Штаб-кватэры Панафрыканскага парламента. Подпісы пад дакументам паставілі Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергеенка і Старшыня Панафрыканскага парламента Форчун Чарумбіра.

Наданне Нацыянальнаму сходу Беларусі статусу назіральніка ў гэтай уплывовай кантынентальнай арганізацыі — важны крок у развіцці дыялогу па любых пытаннях, якія ўяўляюць узаемную цікавасць для Беларусі і 55 афрыканскіх дзяржаў, падкрэслілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.

Афрыка — рэгіён з велізарным патэнцыялам, і за права працаваць на гэтым рынку ідзе вострая канкурэнтная барацьба. Беларусь зарэкамендавала сябе як надзейны і прадказальны партнёр, які выбудоўвае супрацоўніцтва на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемаразумення. Такі падыход выгадна адрозніваецца ад схем, якія навязваюць свету адэпты адміраючай каланіяльнай сістэмы, і адкрывае сур'ёзныя перспектывы нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў эканоміцы і гуманітарнай сферы.

Краіны Афрыкі маюць 25 працэнтаў галасоў у ААН, і ўмацаванне палітычных кантактаў з імі па лініі парламенцкай дыпламатыі будзе садзейнічаць прасоўванню мірных, аб'яднальных ініцыятыў і пабудове справядлівага шматпалярнага свету.

**У ходзе візіту таксама адбылася сустрэча Ігара Сергеенкі са Спікерам Нацыянальнай асамблеі Парламента Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Ангелай Таказіле Дзідзізай.**



Падчас сустрэчы Ігар Сергеенка праінфармаваў паўднёваафрыканскую калегу аб развіцці, эканамічным і тэхналагічным патэнцыяле нашай краіны, аб сацыяльна арыентаванай мадэлі беларускай эканомікі. Для таго, каб дэталёва даведацца аб Беларусі і аб магчымасцях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, кіраўнік Палаты прадстаўнікоў запрасіў Ангелу Таказіле Дзідзізу наведаць нашу краіну з афіцыйным візітам.

Ігар Сергеенка паведаміў, што ў Нацыянальным сходзе сфарміравана рабочая група па супрацоўніцтве з Парламентам ПАР і выказаў упэўненасць, што яе кантакты з аналагічнай структурай у Нацыянальнай асамблеі ПАР будуць садзейнічаць актывізацыі беларуска-паўднёваафрыканскага ўзаемадзеяння па ўсіх кірунках і перш за ўсё ў развіцці дагаворна-прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва.

У ходзе сустрэчы бакі падрабязна абмеркавалі перспектывы развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «У Рэспубліцы Беларусь надаецца асаблівае значэнне экспарту тавараў і паслуг на рынкі афрыканскіх краін. Мы зацікаўлены ў актывізацыі кантактаў з ПАР у галіне гандлю, кааперацыі ў сферы сельскай гаспадаркі і прамысловасці», — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён расказаў аб гатоўнасці беларускага боку пашыраць пастаўкі кар'ерных самазвалаў, сельскагаспадарчай тэхнікі, угнаенняў, камунальнай тэхнікі, аўтобусаў, прадукцыі нафтахіміі, лекаў, тавараў народнага спажывання, прадуктаў харчавання і інш.

Ігар Сергеенка выказаў меркаванне, што паглыбленню эканамічных адносін будзе садзейнічаць абмен візітамі профільных ведамстваў і дзелавых колаў. Ён паведаміў аб гатоўнасці Беларусі да правядзення пятага пасяджэння Беларуска-Паўднёваафрыканскага камітэта па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і чацвёртага пасяджэння Сумеснай міжурадавай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій.

У ходзе сустрэчы была таксама падкрэслена важнасць рэалізацыі праекта па стварэнні ў ПАР зборачнай вытворчасці трактароў па беларускай тэхналогіі пад мясцовым брэндам «Ганда Ганда». Гэты праект, які рэалізоўваецца з 2021 года, дае магчымасць не толькі забяспечыць дробныя і сярэднія сялянскія гаспадаркі Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі даступнай сельгастэхнікай, але і стварае новыя працоўныя месцы.

Абмяркоўваючы перспектывы ўзаемадзеяння ў шматбаковым фармаце, бакі пацвердзілі намер каардынаваць свае дзеянні ў міжнародных парламенцкіх структурах пры разглядзе вострых праблем глабальнага і рэгіянальнага характару. Асабліва па тэматыцы неправамернасці санкцыйнай палітыкі ў адносінах да найбольш уразлівых краін, палітызацыі пытанняў правоў чалавека, праблематыцы забеспячэння глабальнай харчовай і воднай бяспекі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Апазіцыя ў Малдове апратэстуе вынікі выбараў прэзідэнта

Малдаўскі апазіцыйны блок «Перамога» апратэстуе вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Аб гэтым паведаміла ў Telegram-канале прэс-служба апазіцыйнага блока. Адзначаецца, што дзейны прэзідэнт Мая Санду атрымала перамогу над Аляксандрам Стаяногла «толькі дзякуючы махінацыям на еўрапейскіх участках і масавым парушэнням». «Мы перакананы, што кожны дзень праўлення Маі Санду — гэта ўзурпацыя ўлады. Яна не прэзідэнт, а самазванка. Санду прайграла ўнутры краіны і павінна сысці», — адзначаецца ў паведамленні. Апазіцыянеры таксама ўказвалі на няроўныя ўмовы на замежных участках для галасавання, дзе расійская дыяспара, найбуйнейшая па колькасці, магла галасаваць усяго на двух участках, тады як у еўрапейскіх краінах працавала мноства ўчасткаў з недастатковай яўкай. Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава назвала самай недэмакратычнай кампаніяй мінулыя выбары ў Малдове. «Яе адметнымі рысамі сталі беспрэцэдэнтныя рэпрэсіі ўлад у дачыненні да апазіцыі і незалежных СМІ, перш за ўсё рускамоўных, непрыкрытае ўмяшанне краін Захаду ў электаральны працэс і маштабнае прымяненне ўладамі адміністрацыйнага рэсурсу», — адзначаецца ў каментарыі.

### Прафсаюз французскіх фермераў пагражае блакіраваць пастаўкі прадуктаў у краіне

Прафсаюз французскіх фермераў CR47 пагражае блакіраваць пастаўкі прадуктаў у краіне ў выпадку далейшай бяздзейнасці ўлад, перадае РІА «Новости» са спасылкай на агенцтва France-Presse. Адзін са старшынь прафсаюза заявіў агенцтву, што яго арганізацыя разлічвае на ўдзел у маніфестацыі фермераў усяго паўднёвага захаду Францыі.



У кастрычніку па ўсёй краіне зноў пачалі праходзіць акцыі аграрыяў. Фермеры, як і год таму, заклейваюць або пераварочваюць назвы населеных пунктаў на дарогах дагары нагамі — акцыя, якая стала сімвалам пратэснага руху аграрыяў у пачатку гэтага года. Яна заклікана паказаць, што фермеры вымушаны «хадзіць на галаве», цярпячы страты пры адсутнасці падтрымкі дзяржавы.

### У Валенсіі ацанілі шкоду прамысловаму сектару з-за паводак у 10 млрд еўра

Праз тыдзень пасля моцнай паводкі ў Іспаніі, у выніку якой загінулі не менш як 215 чалавек, працягваецца работы па пошуку зніклых без вестак, рамонце інфраструктуры і прыборцы вуліц. Аб гэтым паведаміла іспанская газета El País. Урад аўтаномнай супольнасці Валенсіі ацэньвае шкоду, нанесеную паводкай прамысловаму сектару, у больш за 10 мільярдаў еўра. Ужо разгорнута 7800 вайскоўцаў падраздзялення па надзвычайных сітуацыях (UME) і арміі. Кіраўнік рэгіёна Валенсія Карлас Масон запатрабаваў удзел урада Іспаніі ў прасоўванні і разгортванні пакета першай дапамогі, які складаецца са 136 мер для «аднаўлення, перазапуску і змякчэння наступстваў шторму ў Валенсійскай супольнасці».

Рэгіёны

# Курс — на развіццё

**У Віцебскім аблвыканкаме абмеркавалі перспектывы развіцця Ушацкага раёна. Турызм і мадэрнізацыя сельскагаспадарчай галіны стануць асноўнымі пунктамі яго росту да 2030 года.**

Як адзначыў **першы намеснік старшыні аблвыканкама Генадзь САБЫНІЧ**, раён адстае па многіх сацыяльна-эканамічных паказчыках. На гэта звярнуў увагу Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка, які сёлета наведаў Ушаччыну. Ён даручыў мясцовым уладам сумесна з аблвыканкамам распрацаваць стратэгію развіцця рэгіёна на найбліжэйшы час і перспектыву. Дадзены бізнес-план і быў прадстаўлены на абмеркаванне.

«Мы акцэнтавалі ўвагу на двух асноўных кірунках: сельскай гаспадарцы і турызме. Першае мае на ўвазе развіццё свінагадоўлі, жывёлагадоўлі з раслінаводствам. Другое — турызм, куды ўваходзяць нашы знакавыя праекты: «Прарыў Перамогі», «ЭкстрымПрарыў», развіццё спартыўнай інфраструктуры, санаторна-курортнага лячэння, аграэкасядзіб», — падкрэсліў **старшыня Ушацкага райвыканкама Сяргей САДОЎСКІ.**

На працягу апошніх трох гадоў каля 57 працэнтаў прадукцыі жывёлагадоўлі выпрабляюць свінакомплексы ЗАТ «Віцебскаграпрадукт». У рамках гэтага кірунку ТАА «Сарочына-агра» паспяхова рэалізоўвае інвестыцыйны праект па стварэнні свінакомплексу. Пасля яго завяршэння прыватнае прадпрыемства плануе наступны крок па стварэнні аграхолдынга, які будзе ўключаць усе этапы вытворчасці, пачынаючы ад вырошчвання і заканчваючы вырабам гатовай прадукцыі пад уласным брэндам.

З мэтай прыцягнення інвестараў актыўна задзейнічаны механізм бязвыплатнай перадачы дзяржаўнай невыкарыстоўвальнай маёмасці, а таксама продаж з аўкцыёну, у тым ліку за адну базавую велічыню. Свінакомплексы ЗАТ «Віцебскаграпрадукт» і ТАА «Сарочына-агра» створаны менавіта на базе невыкарыстоўвальных памяшканняў, раённай камунальнай уласнасці. Напрыклад, сялянская фермерская гаспадарка «Вяркудскі падворак» набыла на аўкцыёне маёмасць камунальнай уласнасці ў аграгарадку Вяркуды, дзе займаюцца вырошчваннем авечак.

Яшчэ адзін важны кірунак — захаванне дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. У мэтах павышэння іх эфектыўнасці праводзіць аптымізацыю, у выніку якой у раёне застануцца тры гаспадаркі: КУСГП «Вялікадолецкае», ААТ «Ільюшынскі» і УП «Сафійскія дары», дзе будуць узведзены сучасныя малочнатаварныя комплексы, а таксама праведзена рэканструкцыя існуючых жывёлагадоўчых памяшканняў.

У галіне раслінаводства ў 2024—2025 гадах раённыя ўлады плануюць аптымізаваць структуры пасяўных плошчаў з паэтапным павелічэннем пасеваў шматгадовых траў. Змяненні закрануць вырошчванне азімых і яравых збожжавых і зернебабовых культур. Усе пачатыя і працягнутыя ў наступнай пяцігодцы мерапрыемствы дазволяць захаваць сельскагаспадарчую галіну раёна, а таксама забяспечыць павелічэнне валавой прадукцыі і ўдзельнай вагі раёна ў аб'ёме сельскагаспадарчай вытворчасці вобласці. Цікавы праект плануе ажыццявіць ТАА «Водная даліна» — вытворчасць па вырабе вараных ракаў.

Другая перспектыўная сфера развіцця Ушаччыны — турызм. «У 1980-х гадах з падачы тагачаснага лідара рэспублікі Пятра Машэрава, які бачыў ва Ушацкім раёне ідэальнае месца для адпачынку, быў распрацаваны праект развіцця рэгіёна як курортнага. Праект быў прызнаны практычным, эканамічным і атрымаў на конкурсе чатыры дыпломы з пяці. Па розных прычынах ён не быў рэалізаваны, але Ушаччына мае ўсе падставы стаць буйной агратурыстычнай тэрыторыяй. Развіццё санаторна-аздараўленчага турызму будзе ажыццяўляцца як на базе дзеючых аб'ектаў, так і за кошт будаўніцтва новых», — падкрэсліў Сяргей Садоўскі.

Працягнецца мадэрнізацыя санаторыя «Лясныя азёры», плануецца стварэнне новых аб'ектаў. Маштабны праект збіраецца рэалізаваць ТАА «Вяркудскі падворак», у які ўваходзяць узвядзенне комплексу турыстычных аб'ектаў на тэрыторыі былога недабудаванага санаторыя «Вячэлле». Там будуць аказвацца паслугі па аздараўленні, лячэнні і рэабілітацыі, арганізавана цяплічная гаспадарка, а таксама вытворчасць фермерскай прадукцыі пад брэндам «Вяркудскі падворак» з адкрыццём фірмовай крамы ў райцэнтры.

Для рэалізацыі такіх маштабных планаў неабходны інвестыцыі. Старшыня райвыканкама распавёў, што ў раёне праводзяць сустрэчы з прадстаўнікамі кітайскіх кампаній, каб расказаць ім аб магчымасцях для інвестараў і зацікавіць сумеснымі праектамі. «У нас за паўтара года былі ўжо чатыры дэлегацыі з КНР. Хутчэй за ўсё ў наступным годзе мы заключым пабрацімскі дагавор з горадам Таянь правінцыі Шаньдун. Прыцягваем у тым ліку і беларускіх, і расійскіх інвестараў», — заключыў кіраўнік Ушацкага раёна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Аксане Уладзіміраўне КАЗАК, галоўнаму саветніку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ЯК ГРЭЦЦА, КАБ НЕ ЗАГАРЭЦЦА?

## ЭКСПЛУАТАЦЫЯ ПА ПРАВІЛАХ

Першым прыпыначным пунктам на нашым маршруце стала вёска Лютка Смалявіцкага раёна. Разам з намеснікам начальніка Смалявіцкага РАНС і сацыяльным работнікам наведалі шматдзетную сям'ю, якая знаходзіцца на ўліку. Спачатку праверылі аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, пасля — тэхнічны стан печаў. Як высветлілася, у доме ўстаноўлены дзве печы і адзін камін. З іх толькі адна печ адпавядае патрабаванням пажарнай бяспекі.

— Ацяпленне ў нас пячное, камінам не карыстаемся. Нам прапаноўвалі яго прыбраць, але навошта, стаіць сабе для прыгажосці. Калі палім у печы, выконваем усе правілы бяспекі, дзяцей адных без нагляду не пакідаем. Ніякіх праблем не ўзнікае, нічога не дыміць, — распавяла шматдзетная маці Анастасія Уладзіміраўна.

— Першая печ, відаць, новая, добрая. Адзінае — нельга захоўваць падручныя рэчы ў непасрэднай блізкасці да яе. Не сушыце рэчы ўшчыльную да печы. Па патрабаваннях бяспекі ад вонкавай паверхні печы да любых гаручых матэрыялаў павінна быць не менш чым 10 сантыметраў, — звярнуў увагу Сяргей Тарасевіч. — Другая печ не адпавядае правілам бяспекі. Печ пры праходжанні дымахода праз перакрыцце павінна мець спецыяльнае пашырэнне. Таму яе прыйдзецца перарабіць. Усяго з трох печаў, якія маюцца ў доме, дзве неабходна рамантаваць.

Пасля агляду намеснік начальніка Смалявіцкага РАНС уручыў жанчыне памятку з карыснымі парадамі і рэкамендацыямі ад МНС. Там ёсць уся неабходная інфармацыя, якая датычыцца ацяпляльнага сезона, правілаў эксплуатацыі печаў і не толькі. Сяргей Тарасевіч нагадаў, што паліць печ могуць толькі дарослыя. Нельга пакідаць дзяцей без нагляду. Таксама забараняецца распальваць печ лёгкаўзгаральнымі вадкасцямі, а заканчваць паліць у печы неабходна за дзве гадзіны да адыходу да сну.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## «ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЛА, САМА ЎСЁ ВЕДАЮ...»

Затым разам з Сяргеем Тарасевічам адпраўляемся ў вёску Калюга Смалявіцкага раёна. На вуліцах населенага пункта сустракаем пенсіянерку Лідзію Цімафееўну 1937 года нараджэння. Да яе і заходзім «на агеньчык». Перш за ўсё разам з Сяргеем Тарасевічам правяраем работу аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, затым ужо пераходзім да печы.

— У мяне пакуль адзін пажарны апавяшчальнік. Збіраюся купляць другі, якраз у той пакой, дзе сама сплю, — распавядае Лідзія Цімафееўна.



— Дык вы звярніцеся да прадстаўніка ТЦСАН, і вам бясплатна другі дадуць, — кажа намеснік начальніка Смалявіцкага РАНС.

— Ну дык давайце! Дзеці прыедуць ды павесяць, — усміхаецца пенсіянерка. — А апавяшчальнік працуе спраўна! Я неяк празявала, на вуліцы была, а ён як запішчаў, за кіламетр чуваць!

— Прысядзьце, калі ласка, дам вам пачытаць карысную інфармацыю пра эксплуатацыю печаў...

— Мае вы дзетачкі, я без акуляраў чытаць не буду! — смяецца Лідзія Цімафееўна. — Не бачу без іх нічога, потым абавязкова пачытаю.

— Вы ж ведаеце, што калі паліце печ, рэчы трэба прыбіраць ад яе падалей...

— Ну, ведаю, дзетачкі вы мае дарагія! Я ўжо жыццё пражыла, усё ведаю!

— Нельга захоўваць дровы каля печы, калі паліце, — настойвае намеснік начальніка Смалявіцкага РАНС.

— Ну я зараз пачну паліць, і яны апынуцца ў печы, — парыруе Лідзія Цімафееўна.

Затым Сяргей Тарасевіч нагадаў пенсіянерцы тэлефоны пажарнай службы: 101 і 112. Парэкамендаваў быць асабліва акуратнай пры эксплуатацыі печы, не пакідаць без нагляду.

## ЗГУБНЫЯ ЗВЫЧКІ

Чарговым прыпынкам на нашым маршруце стала яшчэ адна сям'я з вёскі Калюга Смалявіцкага раёна. У невялікім трохпакаёвым доміку пражывае аж шэсць чалавек, у тым ліку адзін непаўналетні. Мужчыны адпачывалі на вуліцы, хутчэй за ўсё, не чакалі гасцей:

«Нас яшчэ летась ставілі на ўлік, бо не выходзілі на працу, выпівалі. Зараз выправіліся», — пачынае размову жыхар дома Міхаіл Сяргеевіч.

Зайшоўшы ў дом, першае, на што звярнуў увагу Сяргей Тарасевіч, — курэнне. Такая згубная звычка можа прывесці да сур'ёзных наступстваў. Праверыўшы спраўнасць печы, Сяргей Тарасевіч вынес наступныя заўвагі: «Па-першае, дома бардак. Раскіданыя па хаце рэчы пры паленні ў печы могуць стаць прычынай пажару. Па-другое, ваша печ ужо на апошнім дыханні, на мяжы. Важна адсунуць канапу далей ад печы, каб забяспечыць адлегласць не менш чым адзін метр. Ваша печ цяпер цёплая. Калі станеце падпальваць, ваша канапа можа загарэцца, таму яе неабходна тэрмінова прыбраць. На печы таксама нічога не павінна захоўвацца. Нагадваю вам, што празмернае ўжыванне алкаголю шкодзіць здароўю і можа прывесці да надзвычайнай сітуацыі. Так, напрыклад, тыдні два таму ў Мінскім раёне загінулі два дзіцяці. Асноўная прычына гібелі — іх бацькі былі п'яныя».



## НА ШТО ЗВЯРТАЕМ УВАГУ

«Усе сем'і, якія мы наведалі, былі з пячным ацяпленнем. Практычна ў кожным домаўладанні былі выяўлены тыя ці іншыя недахопы, якія датычацца выканання патрабаванняў пажарнай бяспекі, — канстатаваў намеснік начальніка Смалявіцкага РАНС. — У кагосьці раздзелка, у кагосьці водступка, у кагосьці побач з печчу захоўваюцца гаручыя матэрыялы, якія могуць загарэцца і прывесці да надзвычайнай сітуацыі. Пры аглядзе, у першую чаргу, заўсёды звяртаем увагу на тэхнічны стан печы. Усё павінна быць спраўна: дымаходы, дзверцы, канструкцыя печы павінна быць без расколін і дзірак, дзверцы павінны шчыльна зачыняцца. Адно з галоўных правілаў і патрабаванняў — у межах паддашкавага пямяшкання печ павінна быць адтынкавана і пабелена для своечасовага вызначэння расколіны, якая можа прывесці да загарання».

Адна з форм работы спецыялістаў ратавальнага ведамства — выступленні ў працоўных калектывах. «Я часта кажу пра тое, што любы дом у працэсе эксплуатацыі крыху рухаецца зімой і летам. Ёсць пашырэнні і звужэнні, з-за якіх у паддашкавым памяшканні з'яўляюцца расколіны на дымаходзе, якія могуць прывесці да выпадзення цаглін, а затым — іскраў і прадуктаў гарэння на перакрыцці. У выніку часта адбываюцца пажары. Менавіта гэта і ўсе асноўныя правілы мы прагаворвалі з кожным чалавекам, якога наведвалі, — падкрэсліў Сяргей Тарасевіч. — Паліць у печы заўсёды трэба пад наглядам. Ні ў якім разе нельга дазваляць гэта дзецям! Калі я працаваў у Барысаве, двое дзяцей засталіся дома адны. Яны адчынілі дзверцы печы, а каля яе ляжалі паперкі з-пад цукерак. У выніку адбыўся пажар, і дзеці загінулі...»

## НЕСУР'ЁЗНАЕ СТАЎЛЕННЕ — СУМНАЯ СТАТЫСТЫКА

Кожная раніца ратавальніка МНС пачынаецца з прагляду зводкі. «На сённяшні дзень (05.11.2024. — **«Зв.»**) у Смалявіцкім раёне адбыліся 84 пажары (летась за аналагічны перыяд — 77), сёлета пяць загінулых (летась — два). Сярэдняя статыстыка загінулых пры пажарах па Смалявічах — 6-7 чалавек за год, — прыводзіць лічбы Сяргей Тарасевіч. — Сёння ў раёне пражывае 25—27 тысяч чалавек. Аднак у летні перыяд за кошт садаводчых таварыстваў насельніцтва раёна прырастае да 50 тысяч!

Па яго словах, першы загінулы пражываў у Мінску. Ён прыехаў у населены пункт, каб аказаць дапамогу сваёй сям'і. Знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, у той час як іншыя члены сям'і дома адсутнічалі, мужчына самавольна залез у гараж. Ужо ўнутры ён закурыў — і згарэў. Другі загінулы — мужчына каля 70, таксама са сталіцы. Ён прыехаў у садаводчае таварыства, якое знаходзіцца на тэрыторыі Смалявіцкага раёна, каб падключыць газавы балон, і вырашыў праверыць яго пры дапамозе запалак. У выніку газ успыхнуў, і ён атрымаў апёкі, не сумяшчальныя з жыццём.

«Трэці загінулы — мясцовы пенсіянер. Разам са спецыялістамі з ТЦСАН прыходзілі да яго з праверкай. Усё было спраўна. Разглядаецца версія (бо гэта здарылася не так даўно) курэння ў стане алкагольнага ап'янення. Апошнія два выпадкі — мінчане. Яны пражывалі ў сталіцы, а сюды ў садаводчае таварыства прыязджалі толькі на выхадны. Пры правядзенні праверак печы былі ў спраўным стане. Да канца не высветлена, але мяркуецца, што гэтыя людзі таксама курылі дома ў стане алкагольнага ап'янення», — распавёў намеснік начальніка Смалявіцкага РАНС.

Асноўная катэгорыя людзей, схільных да стварэння небяспекі, — тыя, хто злоўжывае алкаголем альбо людзі састарэлага ўзросту, якія, як правіла, грэбуюць пытаннямі пажарнай бяспекі. «Па статыстыцы пажылыя грамадзяне часта падвяргаюцца небяспецы падчас выпальвання сухой расліннасці, эксплуатацыі пячнога ацяплення і электраабсталявання, а таксама падчас гатавання ежы на пліце. Таму хацелася б заклікаць усіх: паклапаціцеся пра бяспеку сваіх састарэлых бацькоў. Правядзіце кантроль за станам пажарнай бяспекі домаўладанняў. Зрабіце іх жыццё бяспечным — усталявіце ў домаўладаннях і кватэрах аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі», — падагульні Сяргей Тарасевіч.

Як распавяла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Алена НЕМАГАЙ**, з пачатку года ў Мінскай вобласці адбылося звыш 1,2 тысячы пажараў, у выніку чаго загінулі 114 чалавек. МНС заклікае быць асабліва ўважлівымі падчас ацяпляльнага сезона, берагчы сябе і сваіх блізкіх.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*Смалявіцкі раён.*

# НЕ ДЗЕЛЯ ЗДАБЫЧЫ

## Паляўнічы турызм — перспектыўны кірунак



**Паляўнічы турызм у Беларусі мае вялікі патэнцыял — аб гэтым заявіў на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр КАЗАРЭЗ. Прамысловы напрамак ужо даўно страціў актуальнасць, і сёння менавіта турызм, які прынята падзяляць на ўнутраны і ўязны, з'яўляецца асновай паляўнічай гаспадаркі.**

У мінулым годзе даходы ад унутранага турызму склалі 21 млн рублёў, прадэманстраваўшы прырост да папярэдняга перыяду 108 %. За кошт уязнога турызму атрымана 8,5 млн рублёў, і рост пры гэтым склаў 130 %. Было праведзена 2,5 тысячы паляўнічых тураў. Асноўнымі замежнымі гасцямі сталі паляўнічыя з Расіі — больш за 90 %.

Паспяховасць паляўнічага турызму ў першую чаргу залежыць ад рэсурснай базы. Па даных улікаў, у нашых угоддзях дасягнута аптымальная колькасць лася — больш за 45 тысяч асобін, казулі еўрапейскай налічваецца больш за 130 тысяч, і значны рост таксама зафіксаваны для аленя высакароднага: за 30 гадоў пагалоўе павялічылася ў 20 разоў — да 47 тысяч асобін. Пры гэтым, як асабліва адзначаў спецыяліст Мінлясгаса, канфіскацыя відаў, якія нарміруюцца, праводзіцца без урону для папуляцый і дае магчымасць захоўваць станоўчую дынаміку росту. Больш за тое, нават выдзеленыя квоты часта цалкам не асвойваюцца. Менавіта таму можна казаць пра станоўчыя перспектывы развіцця паляўнічага турызму.

Што датычыцца ўнутранага турызму, то, паводле слоў **начальніка ўпраўлення паляўнічай гаспадаркі РДГА «БТПР» Сяргея ЦАБРУКА,** у мэтах падтрымкі і стымулявання айчынных паляўнічых яны ўжо некалькі гадоў захоўваюць нязменнымі цэны, удасканальваюць сістэму льгот, уводзячы новыя катэгорыі. Улічваючы, што паляўнічы турызм патрабуе пэўных навыкаў, ведаў, допускаў, мае прававыя абмежаванні, уцягнутасць моладзі даволі нізкая. І хоць супрацоўнікі БТПР папулярызуюць паляванне, можна з васьмі гадоў уступіць у арганізацыю на правах «юнага паляўнічага і рыбалова», казаць пра масавасць не даводзіцца. Сярэдні ўзрост большасці сучасных беларускіх паляўнічых — больш за 60 гадоў. І ў гэтым у БТПР бачаць вялікую праблему. У краіне ёсць аднаўляльны прыродны рэсурс, якім можна без шкоды навакольнаму асяроддзю карыстацца, а ўнутраны попыт на яго падае. Неабходна фарміраваць культуру сучаснага палявання, прыцягваць моладзь, тым больш што навыкі і веды, якія набываюцца падчас заняткаў паляваннем, карысныя і ў звычайным жыцці.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ.**

На сваёй зямлі

# МЕСЦА ДЛЯ ПРАЦАВІТЫХ І СМЕЛЫХ

## Меркаванне аб тым, як павярнуць людзей тварам да вёскі

**Не так даўно на «Дажынках» у Валожыне прагучаў яшчэ адзін пасыл да таго, што настаў час вяртацца ў вёску. Кіраўнік дзяржавы гаварыў аб неабходнасці ствараць такія ўмовы ў сельскай мясцовасці, каб людзі імкнуліся жыць і працаваць там, каб ехалі туды нават з Мінска і іншых вялікіх гарадоў, а не наадварот: «Трэба зрабіць так, каб нашы дзеці бегалі басанож па траве, дыхалі свежым паветрам, харчаваліся сваімі прадуктамі. І самае галоўнае, каб у выніку яны не адрываліся ад роднай зямлі, не шукалі сваё шчасце недзе далёка. Каб нашы дзеці хацелі і маглі працаваць на сваёй зямлі...»**

### КАБ СЫН ЗАСТАЎСЯ, НЕ ЗНІКЛА Б ВЁСКА

Проста ў працяг гэтага на самым высокім узроўні прагучала тэма неабходнасці будаўніцтва добрых дарог ад райцэнтраў да аграгарадкоў. Цікава, што амаль тое ж самае, толькі простымі словамі, гаварыў аўтару гэтых радкоў былы калгасны трактарыст, ардэнаносец, 82-гадовы жыхар вёскі Немкавічы Пружанскага раёна Міхаіл Герасімчук. Наша з ім гутарка адбылася ў 2017 годзе. На жаль, шаноўнага ветэрана працы ўжо няма з намі. Захаваліся толькі запісы і тэкст газетнага артыкула. Дык вось, у нястомнага працаўніка калгаснай нівы былі свае рахункі да кіраўніцтва былой краіны перыяду 70-80-х гадоў. Ён лічыў, што няправільная палітыка праводзілася ў адносінах да сельскіх жыхароў. Не заахвочвалі маладых жыць у вёсцы, наадварот, рабілі ўсё, каб яны ўцякалі ў горад: «Якая перспектыва тут была ў майго старэйшага сына? Ні работы з прыстойнай аплатай, ні магчымасці атрымаць добраўпарадкаванае жыллё, ні нават ажаніцца. Бо дзяўчаты нашы, як толькі скончаць школу, бягом беглі — хто ў інстытут альбо тэхнікум, а большасць — на гарадскія прадпрыемствы. Потым ужо едуць у вёску з гарадскімі жаніхамі, тымі ж вяскоўцамі, нядаўна прыстроенымі ў горадзе... А ён, хоць і хіліўся душой да зямлі, паехаў са сваімі аднакласнікамі ў горад. Жыў у інтэрнаце... Каб хоць трошкі будавалі жыллё, можа, мой сын і яго таварышы аселі б тут, можа, не апусцелі б нашы вёскі ўшчэнт. Цяпер вось будуюць шмат, і многае робіць для вялікіх вёсак, цэнтраў калгасаў, а нашы так і засталіся паміраць, бо час упушчаны». Зразумела, чаму ў Міхаіла Юстынавіча балела душа, у сваіх Немкавічах ён заставаўся апошнім жыхаром. Суседзі паўміралі, а іх дзеці аселі ў гарадах.

### «МЫ НЕ ЛЯНІВЫЯ»

У вёсцы ж могуць жыць людзі, якія не баяцца працы, у якіх працавітасць захавалася ад продкаў на генным узроўні. Гэтае разуменне прыходзіць, калі пазнаёмішся з цяперашнімі маладымі жыхарамі населеных пунктаў. Такімі, напрыклад, як шматдзетная сям'я Целяціцкіх. Іх гісторыя — якраз прыклад таго, аб чым гаварылі нядаўна ў Валожыне. Да нядаўняга часу Святлана і Аляксандр былі пінчанамі, жылі і працавалі ў сталіцы Палесся, выхоўвалі траіх дзяцей. Але, атрымаўшы ў Пінску трохпакаёвую кватэру на льготных умовах, прынялі рашэнне перабрацца ў вёску. У Коланску Івацэвіцкага раёна Святлану шмат гадоў чакаў дом яе любімай бабулі.

Сюды і перабралася сям'я прыкладна пяцігодку таму, тут ужо нарадзіліся малодшыя сыны. І цяпер у іх не толькі вялікая сям'я, але і вялікая гаспадарка. Дом таксама будзе вялікі, калі яго канчаткова давядуць да ладу, паводле новай планіроўкі закладзена шэсць пакояў, крыху пабольшае кухня, паменшаюць падсобныя памяшканні. Аляксандр — будаўнік па прафесіі, асноўнае робіць сваімі рукамі.

Цікава, што муж і жонка — абое гараджане, нарадзіліся і выраслі ў Пінску. Але Святлана школьніцай кожнае лета праводзіла ў бабулі, навучылася ўпраўляцца і з каровай, і са свіннёй, і з птаствам. Адсюль любоў да хатняй жыўнасці, што цяпер гадуецца і ў яе хлявах. У іх ёсць дзве каровы, бычок, свінкі рохкаюць, ёсць пару авечак ды козачак, хрумстаюць караняплоды ў клетках трусы. А на птушыным двары гогалем ходзіць чубаты певень з выводкам, а таксама качкі, гусі. Гаспадыня перыядычна закладвае партыю яек у інкубатар, такім чынам выводзяцца куранята. Наогул яна непапраўны эксперыментатар, адночы нават перапёлак вывела ў сваім інкубатары.

Так што сямейная харчовая праграма выконваецца на ўсе сто. Малочныя прадукты свае, мясныя таксама. Лішкі малака Целяціцкія здаюць на прыёмны пункт, мясам дзеляцца са сваякамі — гарадскім бацькам, братам, сёстрам гаспадароў экалагічна чыстага мяса па кавалку рэгулярна перападае.

Першапрычына вялікай гаспадаркі, несумненна, у тым, што Святлана жыўнасць любіць. Як пажартаваў муж: «Ёй каб даў волю, слана купіла б і паставіла тут». Але ж галоўную ролю адыгрывае іх працавітасць, бо пяцёра дзяцей, дом, вялікая гаспадарка прымушаюць гаспадароў шмат працаваць кожны дзень.



Сям'я ЦЕЛЯЦІЦКІХ з Івацэвіцкага раёна.




Яўген УЛЕЗЛА.

Вось гэтую формулу поспеху і дабрабыту сям'і ў вёсцы агучыла аднойчы шматдзетная маці з Кобрынскага раёна Ірына Шавялёва: «Мы не лянівыя», — сказала яна аўтару гэтых радкоў. А хто будзе спрачацца? Ірына ў 30 гадоў мае траіх дзяцей, уласны дом з агародам, год таму выйшла на работу з дэкрэтнага водпуску і ўсюды паспявае.

### З МІНСКА — У ЗАКЛЯЦЕННЕ

Не баяцца працы, часам цяжкай, фізічнай, — і ёсць першая ўмова смельчакоў, якія рашаюцца памяняць горад на вёску. А яшчэ трэба быць гатовым зрушыць з прывычнай каляіны і перамяніць жыццё. Напрыклад, мінчанка Іна Родак памяняла сталіцу на жыццё ў палескай глыбінцы. З ёй я пазнаёмілася летась у вёсцы Закляценне ў Драгічынскім раёне.

У яе свая гісторыя, свой лёс. Яна, мінчанка ў трэцім пакаленні, ніколі не чула пра тое Закляценне, ні сваякоў тут не было, ні знаёмых. Нарадзілася і вырасла ў Мінску, там вучылася і працавала. У яе быў свой невялікі бізнес, па яго справах нейкі час працавала ў Расіі. Але крызіс 2010 года паўплываў на стан спраў не лепшым чынам, а яшчэ дабавіліся асабістыя праблемы. Адным словам, крыху больш за дзесяць гадоў таму яна разышлася з мужам, засталася з даўгамі-крэдытамі, дачкой-студэнткай і дэфіцытам душэўнай раўнавагі. Казала, што яшчэ з пачатку 2000-х паявілася адчуванне, што мегаполіс не яе стыхія. А тут быццам бы і нагода з'явілася нешта перамяніць. Адным словам, вырашыла з'язджаць з Мінска, задно ратаваць рэшткі бізнесу ў Белаазёрску, раней там у яе было невялікае прадстаўніцтва. А там яе суседка Любоў Паўлаўна прапанавала хаціну ў якасці дачы, усяго за 25 кіламетраў ад Белаазёрска. Дом аддаваўся фактычна ў падарунак. Як высветлілася, хата ў Закляценні стаяла зачыненая ўжо чвэрць стагоддзя, а гаспадыня вельмі не хацела, каб дом яе дзяцінства знеслі. Ну і з'ездзіла Іна тады паглядзець не столькі з цікаўнасці, найбольш, мабыць, з ветлівасці. І ў тых зарасніках-джунглях літаральна застыла перад аграмадным, раскошным, векавым дубам. Ён быў як увасабленне нечага сапраўднага, непахіснага. Той дуб, мабыць, усё і вырашыў...

І цяпер у Іны новае жыццё, аграсядзіба пад рамантычнай назвай «Паветра». «Мне гэта цікава, я зразумела, што гэта маё, што ў гэтай справе таксама ёсць магчымасць самарэалізацыі», — гаворыць былая мінчанка. У сваёй сядзібе яна робіць акцэнт на гісторыі, традыцыях палескага краю. Купляе ручнікі і сурвэткі з бабуліных куфраў, упрыгожвае імі пакоі. Шмат займаецца кветкамі, садам, вырошчвае свае ягады, смачна гатуе. І мае ўжо сваіх пастаянных кліентаў-адпачывальнікаў, у асноўным са сталіцы.

### МАЛАДЫЯ ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ

А літаральна ў сераду мне давялося пазнаёміцца з маладымі людзьмі ў Пружанскім раёне, якія выраслі ў вёсцы і свядома выбралі вёску месцам жыхарства і работы. Хоць маглі б, вядома, як і многія іх равеснікі, будаваць свой лёс у гарадах.



Сям'я КАРУНАСАЎ з Пружанскага раёна.

Аляксандр Карунас некалькі месяцаў таму прызначаны галоўным інжынерам сельгаспрадпрыемства «Мурава». Нарадзіўся і вырас у Мураве. Машынны двор ведае з малодшых класаў, бо прыбягаў сюды да бацькі, начальніка мехатрада. Першую адукацыю атрымаў у Пружанскім аграрным каледжы і адразу прыйшоў на работу ў сваю гаспадарку. Потым вывучыўся на інжынера ў Горацкай сельгасакадэміі. Цяпер, дарэчы, без адрыву ад вытворчасці вучыцца там на эканамічным факультэце. Жонка — настаўніца, сям'я ўжо мае траіх дзяцей. Гаспадарка выдзеліла дом. «Ёсць усе магчымасці для прафесійнай самарэалізацыі, для прафесійнага росту, для камфортнага жыцця. Тут таксама трэба некаму працаваць», — сказаў Аляксандр аўтару гэтых радкоў.

Яўген Улезла, малады хлопец, працуе механізатарам у «Мураве». Адслужыў у войску, вярнуўся ў сваю гаспадарку, месяц таму ажаніўся. «Ніколі нават не думаў пра горад. Прыроду люблю, прастор. Выхадных летам амаль не бывае, а калі выпадаюць увосень, зімой, альбо ў водпуск, дамовіліся з жонкай абавязкова ездзіць, падарожнічаць па нашай краіне, каб паглядзець цікавыя мясціны. А для жыцця і ў нас усё ёсць», — кажа механізатар.

### ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Не так даўно размаўляла з 25-гадовай былой брастаўчанкай, якая з сям'ёй цяпер жыве ў адным з абласных цэнтраў нашай краіны. Пацягаўшыся па прыватных кватэрах, яны рызыкнулі, узялі крэдыт і купілі двухпакаёвую «хрушчоўку». У іх такая сітуацыя, што дапамагчы фінансава няма каму. І цяпер уся зарплата мужа, які працуе не па спецыяльнасці на адным з прадпрыемстваў, ідзе на пагашэнне крэдыту, а жывуць усе ўтрох на яе дапамогу па доглядзе дзіцяці. Жыць на такія грошы вельмі цяжка. Я ёй кажу: «Вікторыя, вы за гэтыя грошы купілі б дом у перспектыўнай вёсцы і адолелі б рамонт. Муж работы не баіцца, значыць, знайшоў бы яе і ў сельгаспрадпрыемстве. Верагодна, што зарабляў бы нават больш. Ты магла б адкрыць свой кабінет, напрыклад, па пашыве і рамонце адзення (мае адукацыю і здольнасці) і таксама зарабляла б. У вас быў бы дом, а не кватэра, дзе кухня нагадвае катушок, у які нават халадзільнік не ўлез. У вас ёсць машына, маглі б выбірацца ў горад па неабходнасці. А так, хіба ты бачыш той горад, калі ён працуе ад цямна да цямна, а ў выхадных стараецца яшчэ недзе падпрацаваць, каб зарабіць дадатковую капейку?» Яна задумалася. Потым сказала, што, можа, і згадзілася б перамяніць жыццё, але наўрад ці муж пагодзіцца з такой перспектывай... Хоць зерне сумнення ў яе душы ўпала, буду спадзявацца, што на добрую глебу.

Даўно ведаю і яе, і яе бацькоў. Працавітасць у іх — сямейная рыса, належныя ўмовы можна знайсці ў сельскім населеным пункце у ваколіцах Брэста, бліжэй да малой радзімы. Вось толькі б смеласці ім хапіла ўзяць ды перамяніць жыццё.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**
**і Лізаветы ГОЛАД.**

Весткі з месцаў

# «Лёсу палатно» пачыналася з прадзення

**Апошнім часам значна ўзрасла папулярнасць музеяў, што цалкам заканамерна, бо захаванне памяці аб мінулым — святы абавязак нашчадкаў у імя наступных пакаленняў.**



З гэтаю мэтай у нашай школе створана музейная экспазіцыя «Лёсу палатно».

Яна ўключае чатыры тэматычныя часткі. Першая — «Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX стст.» — распавядае аб адметнасцях падзелу тэрыторыі Беларусі на пэўныя рэгіёны, а назвы іншых гавораць самі за сябе: «Беларускі нацыянальны касцюм», «Прадзенне і ткацтва», «Куфар у вясельнай абраднасці». Экспанаты — а сёння іх колькасць набліжаецца да ста — сабраны ў розных раёнах Гродзенскай вобласці: Бераставіцкага, Ваўкавыскага, Гродзенскага, Зэльвенскага. Тут і кросны, і сукала, і мяліца, і калаўрот, і куфар, і вугальны прас, матавіла, прасніца, даматканыя і вышываныя посцілкі-ручнікі, падзоры...



Асноўным кірункам работы музейнай экспазіцыі з'яўляецца папаўненне фондаў і экскурсійная дзейнасць, а экскурсаводаў мы рыхтуем самі. Вучні школы, адзеўшы нацыянальныя касцюмы, дапамагаюць наведвальнікам дакрануцца да гісторыі нашага краю, яго самабытнасці, даўніх і новых традыцый. У ліку апошніх — правядзенне майстар-класаў, квэстаў для школьнікаў горада, уручэнне наведвальнікам (а з пачатку года іх было каля 800) памятных падарункаў — мяшочкаў-магніцікаў з ільняным насеннем.

Ёсць у нас адмысловая кніга для водгукаў, для цёплых слоў на адрас стваральнікаў і захавальнікаў яшчэ аднаго куточка беларускасці. Сярод іх — нядаўні дырэктар школы Людміла Уладзіміраўна Ніцкая, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Святлана Мікалаеўна Шаціло і Аксана Тадэвушаўна Бітук, педагог дадатковай адукацыі Ганна Мар'янаўна Макарчык, настаўніца пачатковых класаў Юлія Анатолеўна Барбух... Сталярныя ды многія іншыя работы выконваў Андрэй Васілевіч Слонім.



У планах энтузіястаў — заахвоціць вучняў навукова-даследчай дзейнасцю праз удзел у розных конкурсах і праектах; наладзіць партнёрскія сувязі з іншымі музеямі, стварыць новыя экспазіцыі і распрацаваць экскурсіі... А наша «Лёсу палатно» павінна стаць культурным здабыткам, які трэба прэзентаваць людзям.

**Кацярына Талай,**
**настаўніца сярэдняй школы № 41**
**імя А.М. Кузняцова, г. Гродна.**

Зваротная сувязь

# «ТЫ АДНО ЗАПОМНІ, БРАЦЕ, СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ У ХАЦЕ!»

«Што такое восень? — сама ў сябе (ці ў нас?) пытае **спадарыня Вольга Цішаловіч** з Мінска. — І сама ж адказвае, што з аднаго боку — гэта проста пара года, сезон збору ўраджаю, пераходу ад лета да зімы... А з іншага (ну, хто б спрачаўся, асабліва сёлета!) — час проста невыказнай развітальнай прыгажосці; час, калі хочацца марыць, пісаць музыку, вершы, дыхаць халаднаватым цягучым, гаючым паветрам, успамінаць найлепшае з лета і мінулага жыцця...

Апроч таго, восень — гэта час дум, магчыма, сумных, але чыстых і няспешных, калі ўсё ў душы знаходзіць сваё месца».

Знаходзіць, здараецца, не само: з дапамогай іншых.

*«Пасябраваць з газетай «Звязда» мяне прымусіла само жыццё, — піша* **спадар Іван Гаральчук** з Мінска і згадвае цяжкія 90-я, калі разваліўся Савецкі Саюз, калі шмат хто апынуўся на раздарожжы.

*«Мне — уявіце, —* прапануе аўтар пісьма *— было тады пад сорак, мой малодшы сын перайшоў у пяты клас, а ў школе — сапраўдны перапалох, там толькі і гутаркі, што ўсе прадметы будуць выкладацца на беларускай мове...*

*Хтосьці дзвюма рукамі «за» такое новаўвядзенне, хтосьці — рашуча супраць. Мне ж здавалася лагічным усе дакладныя навукі выкладаць па-руску, усе гуманітарныя — на роднай мове.*

*Вось гэта сваё перакананне мне хацелася давесці да іншых. Я напісаў ліст у газету «Звязда», адправіў і праз досыць кароткі час убачыў яго на старонках, прычым у выглядзе зусім не маленькага артыкула, гэта значыць, з усімі маімі аргументамі.*

*З той публікацыі і пачалося наша сяброўства: я пастаянна выпісваў «Звязду», пастаянна чытаў. У тыя гады, на мой, зразумела, погляд, яна больш пісала пра эканоміку, сельскую гаспадарку, работу самых розных устаноў, пра людзей... Цяпер газета больш афіцыйная, можа, нават афіцыёзная, але ж я ўпарта не здраджваў ёй, таму што заўсёды знаходзіў для сябе нешта цікавае і патрэбнае. А ўжо тады, калі пачаў «алёкаць» па адмысловым звяздоўскім провадзе ды зразумеў, як шмат людзей мяне чуюць, дык і ўвогуле, можна сказаць, «зазвяздзіўся»!*

*Мая сям'я супраць гэтага нічога не мела, нават наадварот — шчыра падзяляла маё захапленне гэтай газетай яшчэ і таму, што я заўсёды адпраўляў свае карткі на розыгрыш прызоў і час ад часу нешта выйграваў. Прычым не толькі па драбязе (прас, свяцільнік, мангал)... Неяк,* — працягвае **спадар Гаральчук,** *— пашчасціла на трымер, неяк — на тэлевізар ад «роднай газеты...»*

*Што да роднай мовы, то на маёй гістарычнай радзіме (паўднёвы захад Беларусі) яна істотна адрозніваецца ад газетнай. І, тым не менш, дзякуючы «Звяздзе», я заўсёды адчуваю сябе беларусам не толькі таму, што жыву ў гэтай краіне. Таму, што цудоўна разумею мову маіх любімых «Тутэйшых», «Новай зямлі» ды іншых сапраўды вялікіх твораў і класікаў, і нашых сучаснікаў.*

*...Чаму пішу на гэты раз?*

*Быў грэх (банальныя праблемы з грашыма): зносіны з газетай я вырашыў паставіць на паўзу: месяц-другі пачытаць кніжкі, а «Звязду» — хіба ў інтэрнэце... Ну чаму б і не?*

*Думаеце, пачытаў? Ні ў якім разе! У мяне на гэта... часу не было. А на папяровую чамусьці хапала.*

*Не ведаю, якімі словамі, жонка сказала пра гэта сыну і... Сюрпрыз: з лістапада я зноў падпісчык «Звязды». Адчуванне — быццам камень з душы зваліўся...»*

Згадзіцеся: цікавы ліст — сваім экскурсам у мінулае, сваім поглядам на ўчарашнюю і сённяшнюю газету, на мову, сваім досыць важным для рэдакцыі прызнаннем: «Я заўсёды знаходзіў для сябе нешта цікавае і патрэбнае».

Ці не пра тое ж і ў лісце з Оршы.

*«Апошнім часам шмат хто сочыць за неспрыяльнымі днямі. У мяне яны таксама ёсць, —* прызнаецца **спадар Мікалай Камароўскі** і ўдакладняе, што *— іх, гэтых дзён, па два на кожным тыдні: нядзеля і панядзелак, калі ў паштовай скрынцы няма «Звязды».*

*«Думаю, што не толькі для мяне «родная газета на роднай мове» і ў мінулым веку была, і ў гэтым застаецца чыстым паветрам, дзякуючы якому жывеш, па-свойму думаеш і адчуваеш, нешта ўспамінаеш. Нядаўна вось зачапіўся вокам за прымаўку «чорт сем пар лапцяў стаптаў, пакуль пару дабраў» і ўспомніў аж дзве такія. Міша быў ростам — метры за два! Мы, дзеці, часта бегалі да пясчанага кар'ера, каб паглядзець, як ён змяшчаецца ў кабіне свайго бульдозера, як умудраецца ім кіраваць... У дарослых было не меней цікавасці ды непрыстойных жартаў, бо за жонку Міша ўзяў зусім невялічкую Рэню...*

*З райцэнтра, з радзільні, гэта маладая сям'я дабіралася рэйсавым аўтобусам, які надзейна засеў у снезе ў самым пачатку вялікай вёскі.*

*Нехта прапаноўваў шчасліваму бацьку схадзіць па каня ці хоць бы па санкі, але Міша наадрэз адмовіўся, сказаў: «А рукі нашто?», пасля чаго згроб у ахапак маладую жонку з дачушкай і панёс іх да самай хаты...*

*Другая адмысловая пара жыла на паралельнай вуліцы і знешне выглядала якраз наадварот: Лёдзя была жанчынай дзябёлай, мужчынскага складу, а яе Валодзька — нізенькі, худзенькі, гультаяваты і не сказаць, каб разумны... Да гарэлкі неяк дарваўся. І, мусіць жа, на халяву, бо напіўся так, што заснуў пад крамай. Нехта наказаў жонцы...*

*Не, свайго мужа на руках яна не панесла — павезла... у дзіцячым вазку. Во дзе смеху было!»*

*«Многае сціраецца з памяці, —* прызнаецца **спадар Камароўскі,** *— многае — не, а таму звяздоўскі «провад» — з'ява ўнікальная. Калі ласка, не абрывайце яго, бо тады, мне здаецца, паблякне святло, што заўсёды сыходзіла і сыходзіць ад нашай «Звязды».*

Прыемна, што клопат аб ім, гэтым святле, — справа не толькі газеты, але і чытачоў. Пацвярджэннем таму — яшчэ адзін ліст. *«Гадоў пяць назад цяжка хварэла адна з нашых супрацоўніц, —* піша **спадарыня Алена Кузьмічова** з Мінска. *— Мы, калегі па рабоце, наведвалі яе спачатку ў бальніцы, потым дома, у якім уразіла не столькі кватэра (у «сталінцы», у цэнтры...), колькі сам пад'езд, дзе на самым уваходзе на падаконніку ляжала так званая друкаваная прадукцыя. Спытала, хто яе там пакідае, і пачула, што самі жыльцы, бо газеты, часопісы, кнігі, якія не патрэбны ў адной кватэры, маглі спатрэбіцца ў другой... Мне спадабалася гэта ідэя, і я перанесла яе ў свой пад'езд. Не буду хлусіць, што пакідаю на падаконніку шмат выданняў, але «Звязду» — часцяком, і ні разу яшчэ не было такога, каб газету ніхто не забраў».*

Забраўшы, нехта, магчыма, і выпісаў.

Хацелася б верыць, бо...

*«Мне ўжо 84 гады, але я па-ранейшаму пастаянна выпісваю і чытаю сваю роднамоўную «Звязду», — згадвае* **спадар Альфрэд Францавіч Тычко** з Мёршчыны. *— Некалі, у канцы 1990-х, дасылаў свае вершы ў рубрыку «Хто каго?» і праўдзівыя гісторыі на звяздоўскі «провад». Найсвятлейшыя ўспаміны засталіся аб гэтым супрацоўніцтве!.. Нядаўна ўдваіх з унукам праглядалі мой «архіў» і знайшлі там шмат цікавага. «Песню старога халасцяка» вырашылі адправіць у рэдакцыю: актуальная, здаецца, тэма...»*

Як, зазначым, і прызнанне ў першых радках:

*Век дваццаты сышоў у нябыт,*
*Дваццаць першы ідзе па планеце.*
*Яму б светлым ды радасным быць,*
*Як хацелі ўсе людзі на свеце...»*

Але (і на жаль!) не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяваецца. Напрыканцы свайго ліста спадар Іван Гаральчук звяртаецца да дзяцей пенсіянераў з просьбай паклапаціцца пра сваіх бацькоў. Даслоўна: *«Для іх — я па сабе мяркую — падпіска на любімыя газеты і часопісы стане добрым падарункам на дзень нараджэння, Новы год ці іншае свята».*

Зрэшты (дададзім ад сябе), кветкі (і падарункі ж таксама?) павінны быць без нагоды, шчасце — сапраўдным, дом — цёплым, каханне — узаемным. Надвор'е?..

Рэмарк пісаў, што без розніцы, якое.

Вось тут можна было б паспрачацца (асабліва на пачатку зімы), аднак нехта з чытачоў настойліва раіў:

*«Ты адно запомні, браце,*
*Са «Звяздой» цяплей у хаце!»*

Так было, так ёсць, мяркуючы па пошце і, магчыма, будзе.

**Аддзел пісьмаў.**




***Натхніўшыся цёплымі словамі ў адрас «Звязды», мы вырашылі вам нагадаць, што падпіска на газету на першы квартал і першае паўгоддзе 2025 года ўжо пачалася. Мы абяцаем, што, як і заўсёды, «Звязда» застанецца для вас дакладнай крыніцай разнастайнай інфармацыі, уважлівай і спагадлівай суразмоўніцай, пляцоўкай для вашых меркаванняў і для вашай творчасці. Абавязкова будзе і традыцыйны розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў, у якім, як заўсёды, разыграем штосьці карыснае для вашай гаспадаркі, для вашага дома. Тых, хто аформіць падпіску, у студзеньскіх нумарах газеты чакаюць нашы фірменныя падарункі: прыгожы насценны каляндар, каляндар рэлігійных свят для ўсіх асноўных канфесій, каляндар народных свят, якім з задавальненнем карыстаюцца настаўнікі і кіраўнікі фальклорных гуртоў, а таксама папулярны ў вяскоўцаў і дачнікаў месяцавы каляндар садавода-агародніка.***

***Але ніякія падарункі не заменяць шчырай размовы аб тым, што вас хвалюе; пра тое, што для вас важна. Гэта мы вам таксама абяцаем у новым годзе.***

***Заставайцеся са «Звяздой» — будзе цікава!***

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
6 лістапада 2024 г. № 42 (775)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «ДА ЎСІХ ТРЭБА СТАВІЦЦА З ПАВАГАЙ І ЦЯРПЕННЕМ»

## У Кіраўскім раёне Савет Рэспублікі падвёў вынікі работы са зваротамі грамадзян і прааналізаваў эфектыўныя метады гэтай работы ў рэгіёне

**Выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ было праведзена на базе ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» ў Кіраўскім раёне Магілёўскай вобласці. Удзел у ім прынялі сенатары, прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улады, Маладзёжнага парламента, грамадскіх арганізацый.**



Фота БелТА.







### Дзейнічаць сістэмна

Аналіз работы са зваротамі грамадзян праводзіўся на прыкладзе Магілёўскай вобласці. У кастрычніку Савет Рэспублікі правёў на тэрыторыі вобласці адзіны дзень прыёму грамадзян. Перад гэтым падобны прыём на Магілёўшчыне праводзіўся два гады таму.

Як адзначыў у сваім дакладзе **загадчык аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі Сакратарыята Савета Рэспублікі Максім ШЭКО**, колькасць зваротаў да сенатараў паступова зніжаецца, але назіраецца рост паўторных і калектыўных. На першым месцы — пытанні ЖКГ, землекарыстання, землеўпарадкавання.

— Работа са зваротамі грамадзян прыярытэтная ў нашай дзейнасці, — падкрэсліла, звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння, Наталля Качанава. — Гэту форму мы выкарыстоўваем пастаянна, таму што законы, як кажа наш Прэзідэнт, павінны ісці ад зямлі. Людзі на прыём прыходзяць розныя. Да ўсіх трэба ставіцца з павагай і цярпеннем. Выслухаць, што іх хвалюе, і ўзяць на заметку. З пытанняў, якія да нас паступаюць, фарміруюцца ў тым ліку і прапановы па змяненні ў законы. Калі ёсць новыя выклікі ці праблемы, гэта трэба рабіць.

Кіраўніцтва вобласці пераканана, што работа са зваротамі грамадзян дазваляе апаратыўна рэагаваць на патрэбы насельніцтва і працаваць з апераджэннем. Як адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Мікалай ДЗЯДКОЎ**, па выніках разгляду зваротаў у 2022—2023 гадах станоўча вырашаны шэраг значных для жыхароў вобласці пытанняў у сферы жыллёва-камунальнага будаўніцтва і інжынерна-транспартнай структуры, прыняты меры па паляпшэнні якасці пасажырскіх перавозак, даступнасці аказання медыцынскай дапамогі. Сёння ў прыярытэце тая ж тэматыка: жыллёва-камунальная гаспадарка, архітэктура і будаўніцтва, жыллёвы фонд, землеўпарадкаванне і землекарыстанне, гандаль і спажывецкі рынак, транспарт, занятасць насельніцтва, ахова працы, сацыяльнае і пенсійнае забеспячэнне.

— Работа з насельніцтвам — найважнейшая задача, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА**. — Мы сістэматызуем звароты грамадзян і аналізуем, па якіх кірунках больш за ўсё звяртаюцца нашы людзі. Робім гэта таму, што ёсць пытанні сістэмныя, а ёсць прыватныя. Гэта не значыць, што апошнія трэба пакідаць без увагі. Трэба толькі выбудаваць падыходы. Пры фарміраванні бюджэту наступнага года закладваем пэўныя сумы па вызначаных кірунках. Магіляўчан хваляваў стан дарог, шмат было выказванняў на гэты конт у інтэрнэце. Сёння мы практычна знялі гэта пытанне. Звароты прысутнічаюць, але ў цэлым вастрыню пытання атрымалася зняць. Астатняе трэба дапрацоўваць. Наступны кірунак, які хваляваў грамадзян, — дваровыя тэрыторыі. Мы заняліся гэтай тэматыкай. Летась прынялі рашэнне, што будзем заходзіць у двары комплексна. Робім дах, стыкавыя панэлі, праезды, плюс дзіцячая пляцоўка. Мы пабудавалі больш чым 100 дзіцячых пляцовак. Вядома, усё не ахапілі, за год усё не зробіш. Але бачым водгукі людзей і ведаем, што на правільным шляху. Таму ўмацоўваем гэты кірунак. Кожны наш раён ганарыцца гісторыяй, і гэты пасыл быў выкарыстаны. Рабілі пляцоўкі з патрыятычным ухілам, таму што гэта яшчэ і выхаванне.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Пасадка лесу, сустрэча з актывам, наведванне сацыяльнай установы



Рабочы тыдзень сенатараў атрымаўся разнастайным

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА** ўзяла ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё!». Ад стыхіі на Гомельшчыне пацярпела 16,7 тысячы гектараў лесу, 10 тысяч з іх падлягаюць аднаўленню. Сенатар разам з супрацоўнікамі свайго прадпрыемства высадзілі хвойныя дрэвы на дзялянцы ў Гомельскім раёне. «Мы не першы раз бяром удзел у падобнай акцыі, бо тэма пасадкі лясоў актуальная заўжды. Лес — наш здабытак і багацце. Гэта аднаўляльная крыніца прыроды, якая патрэбна будучым пакаленням. Мы сёння закладваем рэсурс на шмат гадоў наперад, які робіць нашу родную зямлю чысцейшай і прыгажэйшай. А ў наступным годзе пастараемся вярнуцца і ацаніць вынікі нашай працы», — адзначыла парламентарый.

* * *

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала СМАЛЯК** сустрэлася з актывам Камуністычнай партыі Беларусі Брагінскага раёна. Напярэдадні Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнікі сустрэчы абмеркавалі сумесную работу з моладдзю, грамадскімі арганізацыямі, іншымі партыямі па самых розных кірунках. Асаблівы акцэнт Ала Смаляк зрабіла на важнасці патрыятычнага выхавання, захавання гістарычнай праўды. Таксама гаворка ішла аб святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Кастрычніцкая рэвалюцыя — эпахальная падзея, якая змяніла ход сусветнай гісторыі. З гэтай датай мы звязваем шматлікія перамогі, працоўныя здзяйсненні і дасягненні народа, народа-стваральніка. Сёння ў нашай краіне, суверэннай, якая смела ідзе наперад, захаваліся многія заваёвы Кастрычніка, такія як справядлівасць, роўнасць, працавітасць і іншыя», — падкрэсліла сенатар. Напярэдадні свята парламентарый пажадала ўпэўненасці і аптымізму, дасягнення ўсіх пастаўленых мэт.

Цёплыя, шчырыя, сардэчныя словы віншаванняў ад члена Савета Рэспублікі ў гэты дзень прымаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, камуніст Васіль Аляксандравіч Нікалаенка — адзіны ветэран, які застаўся ў Брагінскім раёне. У гэтым годзе ён адсвяткаваў свой 100-гадовы юбілей. Сенатар выказала бязмерную ўдзячнасць, падзяку ветэрану за подзвіг, мужнасць, адвагу і мірнае неба Беларусі.

* * *

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марына ІЛЬІНА** і члены Камісіі ўпаўнаважаных па правах дзіцяці дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў наведалі дзяржаўную ўстанову адукацыі «Мінскі гарадскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі». Дырэктар Вольга Капліна правяла экскурсію па ўстанове і прадставіла досвед працы цэнтра.

«Сацыяльная абарона людзей з інваліднасцю — у ліку прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. У Беларусі падтрымка людзей з абмежаванымі магчымасцямі ўключае грашовыя выплаты, адрасную дапамогу, шырокі спектр сацыяльных паслуг, ільгот і гарантый. Адным з ключавых кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы з'яўляецца клопат аб дзецях-інвалідах. На паляпшэнне якасці жыцця людзей з абмежаванымі магчымасцямі, паспяховую інтэграцыю ў грамадства накіраваны ў тым ліку і дзяржаўныя праграмы. Работа ідзе ў цесным узаемадзеянні органаў сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту і турызму, грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў і іншых структур», — сказала сенатар.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «ДА ЎСІХ ТРЭБА СТАВІЦЦА З ПАВАГАЙ І ЦЯРПЕННЕМ»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 7-й стар.)*

Прыцягваем і насельніцтва да будаўніцтва пляцовак. Не таму, што не ў стане самі гэта зрабіць, а таму, што ламаць менш будуць. Тут галоўнае — выхаванне. Насельніцтва хвалюе і медыцынскае абслугоўванне. Мы пераарыентавалі частку бюджэтных сродкаў на гэтыя мэты. Сёлета вядзём рамонт, будаўніцтва васьмі бальніц і паліклінік раёна. Умацоўваем міжрэгіянальныя цэнтры, прыблізна на 15 мільёнаў долараў закупілі медабсталявання. Гэта ўсё дало нам станоўчы эфект. Спадзяёмся, што і медыкі будуць больш уважлівымі да пацыентаў. Матэрыяльны бок мы вырашылі, важна, каб і кадры спрацавалі адпаведна. У Магілёве пабудаваны арэндны жылы дом для медработнікаў.

Старшыня аблвыканкама адзначыў, што былі пытанні да сістэмы адукацыі. Сёлета на вырашэнне іх было выдзелена парадку 70 мільёнаў рублёў. Практычна ўсе школы адрамантаваныя, у тым ліку сельскія. Плюс дзеці пераведзены на новую форму харчавання.

— Усё ў комплексе дае пэўны эфект, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. — Нельга сказаць, што праблем няма. Яны ёсць. Праблема ў тым, што ёсць школы, дзе на невялікую колькасць вучняў 26 выкладчыкаў. Бюджэт не вытрымлівае дадзеную нагрузку. І пытанне трэба вырашаць, хаця яно балючае. Працей дзяцей падвозіць у буйныя школы. Дзякуючы праграме Прэзідэнта, з гэтым няма праблем. Ёсць пытанне па зносе грамадскага аўтатранспарту, трэба паскоранымі тэмпамі яго мяняць. І гэту праграму трэба ўмацоўваць абавязкова.

Што датычыцца работы па прыватных зваротах грамадзян, то, на думку Анатоля Ісачанкі, гэта часам недапрацоўка саміх чыноўнікаў.

— Шмат чаго можна вырашаць на месцы, — рэзюмуе ён. — Аблвыканкам выдзеліў кожнаму раёну па 6,5 тысячы рублёў для вырашэння дробных пытанняў. Дробязь, але хопіць той жа калодзеж падрамантаваць, зону адпачынку добраўпарадкаваць.

## Працуем талакой

Разглядам зваротаў грамадзян займаюцца не толькі сенатары, прадстаўнікі выканаўчай улады і дэпутаты, на апярэджанне працуюць грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі, прадстаўнікі мясцовага самакіравання.

Вопытам работы падзяліўся **старшыня Каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый Магілёўскай вобласці Андрэй НІКІЦІН**.

— Для аператыўнага і аб'ектыўнага адказу грамадскасці на бягучы запыт насельніцтва і быў створаны пры Магілёўскім аблвыканкаме першы ў краіне каардынацыйны савет, які працуе ў практычнай плоскасці, а не на словах, — падкрэсліў ён. — Дзейсным інструментам работы з насельніцтвам сталі грамадскія прыёмныя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Прыём грамадзян вядуць не толькі актывісты грамадскай арганізацыі, але і іншых структур, напрыклад, дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. Прафсаюзы заканадаўча маюць права кантраляваць працэс захавання правоў працоўных. Сёлета гэтыя арганізацыі ў рамках разгляду зваротаў работнікаў наконт незаконна ўтрыманых або недаплачаных ім грашовых сродкаў вярнулі больш чым мільён рублёў.

Па словах выступоўцы, насельніцтва звяртаецца ў грамадскія структуры не толькі па падтрымку сваіх правоў, але і па дадатковую дапамогу, у тым ліку матэрыяльную. Летась, напрыклад, грамадскімі арганізацыямі для забеспячэння пытанняў сацыяльнай палітыкі было прыцягнута болей чым два мільёны долараў. Актыўна выкарыстоўваюцца і ўласныя сродкі грамадскіх арганізацый, у тым ліку і для гуманітарнай дзейнасці ў адносінах да бежанцаў і мігрантаў. Абласныя структуры «Чырвонага Крыжа», Фонду міру , Дзіцячага фонду на працягу двух апошніх гадоў аказалі дапамогу болей чым 35 тысячам чалавек. У тым ліку ў матэрыяльным выяўленні на суму больш чым два мільёны рублёў. Грамадскія аб'яднанні ўдзельнічаюць у зборы сродкаў на добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў. Цяпер у вобласці вядзецца збор сродкаў на будаўніцтва музея Славы Магілёўшчыны.



Пра дзейнасць органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання на прыкладзе Крычаўскага раёна расказала **старшыня Крычаўскага райсавета Ірына ПРУДНІКАВА**.

— Старасты, старшыя дамоў, старшыя камітэтаў — гэта першыя памочнікі ў нашай дзейнасці, — адзначыла дэпутат. — Райцэнтр падзелены на восем мікразон, у кожнай абраны старшыня. Яны і дапамагаюць нам, дэпутатам, знаходзіць актыўных людзей, якія замацоўваюцца за дамамі і вуліцамі. Такіх у нас задзейнічана 218 чалавек. Гэта людзі розных узростаў, прафесій, якія выбіраюцца насельніцтвам шляхам галасавання на агульных сходах. У сельскай мясцовасці нашы памочнікі — старасты. У інтэрнэце створаны групы, праз якія насельніцтва можа задаць любое пытанне. Гэта аператыўна і эфектыўна. Пытанне здымаецца ў кароткія тэрміны. Добрая практыка.

Старшыня Савета Рэспубліка ў хваліла крычаўскі вопыт і пажадала, каб гэта практыка была распаўсюджана на іншыя рэгіёны. Бо форма працуе на папярэджанне скаргаў і спрыяе стварэнню згоды ў грамадстве.

Пра работу з насельніцтвам на прыкладзе **Ходасаўскага сельсавета** расказаў яго **старшыня Анатоль ПРУДНІКАЎ**. У Мсціслаўскім раёне гэта адзін з самых буйных сельсаветаў.

— У зоне асаблівай увагі — пытанні жыццезабеспячэння грамадзян, — паведаміў старшыня сельсавета. — У цесным узаемадзеянні з органамі выканаўчай улады вырашаюцца надзённыя пытанні сацыяльнай накіраванасці. Папулярнасцю ў насельніцтва карыстаюцца дні дэпутата, святы вёсак, а таксама рэалізацыя сумесных ініцыятыў. Прыярытэтным кірункам дэпутацкага корпуса з'яўляецца работа народных выбраннікаў на месцах. Асноўная частка пытанняў вырашаецца аператыўна або тлумачыцца на момант паступлення. Тыя пытанні, якія патрабуюць дадатковага рашэння, вывучаючца і вырашаюцца ва ўзаемадзеянні з упраўленнямі і аддзеламі райвыканкама, а таксама арганізацый. У рамках дзён дэпутата працуюць адначасова дэпутаты абласнога, раённага і сельскага ўзроўню. І гэта карысны вопыт.



**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА расказаў: «Мы пабудавалі больш чым 100 дзіцячых пляцовакі. Вядома, мы ўсё не ахапілі, за год усё не зробіш. Але мы бачым водгукі людзей і ведаем, што на правільным шляху. Таму ўмацоўваем гэты кірунак. Мы прыцягваем і насельніцтва да будаўніцтва гэтых пляцовак. Не таму, што не ў стане самі гэта зрабіць, а таму што ламаць менш будуць. Тут галоўнае – выхаванне».**

## Наша мэта — мір і стабільнасць

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў краіне выразна выбудавана работа са зваротамі грамадзян. І эфект значны. Але жыццё ідзе, і ўзнікаюць новыя пытанні. І ў іх трэба вельмі ўважліва разбірацца.

— У краіне шмат чаго робіцца для таго, каб жыццё было камфортным і спакойным, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Сёлета наша эканоміка вельмі добра спрацавала. Гэта відаць па тым, як працуюць сацыяльныя праграмы. Двойчы павышаліся пенсіі, падоўжаны тэрмін дзеяння сямейнага капіталу, пашыраны магчымасці яго прымянення. Укладаюцца вялікія сродкі ў будаўніцтва дарог, жылля. Пра гэта таксама павінна ведаць насельніцтва. Бо ўсё, што робіцца, накіравана выключна на росквіт нашай краіны і рост дабрабыту людзей. Пра гэта вельмі важна помніць у такі неспакойны час, калі вакол краіны ідзе нагнятанне абстаноўкі, вядуцца спробы ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы. Трэба ўсяму гэтаму супрацьстаяць. Мы павінны захаваць мір і стабільнасць у краіне.

**Старшыня Магілёўскага аблсавета, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Аляксандр ГАРОШКІН** назваў работу выязнога пасяджэння вельмі карыснай і эфектыўнай.

— Мы дзелімся вопытам, глядзім, што робяць на месцах, чым займаюцца сельсаветы, раённыя, гарадскія і абласныя Саветы дэпутатаў. І як вынік гэтай работы здымаецца напружанне ў грамадстве, — аргументаваў ён. — У ходзе выязнога пасяджэння неадночы гучала думка, пра якую пастаянна гаворыць кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка, спасылаючыся на Канстытуцыю, што Беларусь — гэта дзяржава для народа. У нас робіцца ўсё для таго, каб чалавек, які жыве на зямлі, адчуваў сябе камфортна. Мы павінны ведаць, чым жывуць людзі, якія праблемы ў іх існуюць і выпрацоўваць шляхі іх вырашэння. У ходзе такіх пасяджэнняў выяўляюцца менавіта метады вырашэння гэтых задач.

Мы бачым, што запыты сёння розныя. Па сутнасці, яны павінны вырашацца нават не на ўзроўні вобласці ці краіны, а на ўзроўні сельсаветаў і раёнаў. Але ёсць пытанні, якія павінны вырашацца на заканадаўчым узроўні. Мы павінны іх выяўляць і своечасова даносіць да Савета Рэспублікі, а гэта і задача сенатараў у тым ліку.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Аляксандр БАГЕЛЬ** падкрэслівае, што работа з насельніцтвам дапамагае адчуваць настрой грамадства.

— Трэба быць уважлівым да прапаноў людзей, калектываў, без гэтага нельга, — заўважае ён. — Асабліва сёння, напярэдадні такой значнай падзеі, як выбары Прэзідэнта. Ад нашага выбару залежыць, што будзе з нашай краінай.

— Вырашэнне пытанняў жыхароў — галоўная задача, якая стаіць перад дэпутацкім корпусам, — адзначыла **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ**. — Нам трэба разумець, што хвалюе нашых людзей. Пра гэта мы даведваемся на нашых з імі сустрэчах. А ўдзел у такіх пасяджэннях з удзелам Прэзідыума Савета Рэспублікі — добрая школа, вопыт, абмен меркаваннямі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Кіраўск*

# РАБІ САМ — НАТХНЯЙ ІНШЫХ

## 25 найлепшых. І гэта толькі пачатак

**Падзяліцца напрацоўкамі, разабраць цяжкасці, якія ўзніклі ў рабоце, натхніць на новыя здзяйсненні... Першы ў сваім родзе абласны Форум грамадзянскіх ініцыятыў прайшоў на Гомельшчыне. Ён сабраў актыўных жыхароў населеных пунктаў, прадстаўнікоў ініцыятыўных груп, мясцовых органаў улады, дэпутатаў. Зацікавіліся маштабным мерапрыемствам па папулярызацыі грамадзянскай актыўнасці ў Гомельскай вобласці і госці з Расійскай Федэрацыі. Так, да Форуму «Ад ідэі — да выніку» далучылася і дэлегацыя з Браншчыны.**





### Першыя важныя крокі

На пачатку Форуму яго ўдзельнікаў прывітала **член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ**. Сенатар адзначыла вялікую ролю, якую адыгрывае Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў у арганізацыі і ажыццяўленні праектаў грамадзянскіх ініцыятыў у рэгіёне.

— У нас значна актывізавалася праектная дзейнасць. У гэтым годзе Гомельскі абласны Савет дэпутатаў для правядзення конкурснага адбору накіраваў у асацыяцыю 111 заявак, 25 — сталі пераможцамі. І 20 з іх ужо рэалізавана, а яшчэ пяць — плануецца рэалізаваць да канца года, — зазначыла член Савета Рэспублікі.

Кацярына Зенкевіч звярнула ўвагу на тое, што на Гомельшчыне актыўнасць рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў не абмяжоўваецца толькі ўдзелам у конкурсе праектаў. На месцах, у сваіх населеных пунктах шмат важных і карысных ідэй увасабляюць у жыццё неабыякавыя мясцовыя жыхары. Між тым сёння матывуюць сваіх землякоў уключацца ў гэту работу, брацца за новыя праекты ў тым ліку ўдзельнікі навучальных семінараў.

Як нагадала член Савета Рэспублікі, з гэтага года Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў правяла шэраг навучальных трэнінгаў па праектнай дзейнасці. Так, сёння дэпутацкі корпус вобласці прапануе актыўным жыхарам рэгіёна вучыцца папулярызаваць вопыт грамадзянскіх ініцыятыў. У бягучым годзе Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў арганізавала практычнае навучанне па асновах праектнага менеджменту для супрацоўнікаў сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі, сацыяльнай службы, органаў і камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, актывістаў з розных раёнаў вобласці. Важным крокам у гэтым плане для Гомельскага рэгіёна стаў і спецыяльны адукацыйны курс «Школа рэгіянальнага развіцця». Прадстаўнікоў мясцовых Саветаў дэпутатаў, 20 актывістаў з розных раёнаў, якія якраз прайшлі навучанне па гэтым курсе, на Форуме прывітала старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

— Упэўнена, што тыя, хто прайшоў гэты курс, працягнуць навучальную работу на месцах. Бо самае галоўнае ў любой справе — зрабіць першы крок, але мы яго ўжо зрабілі. Таму задача выпускнікоў «Школы рэгіянальнага развіцця» — натхніць сваіх землякоў на новыя цікавыя і значныя праекты, — заклікала Кацярына Зенкевіч. — Рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў стварае ўмовы для раскрыцця патэнцыялу кожнага чалавека, а гэта, у сваю чаргу, садзейнічае ўстойліваму рэгіянальнаму развіццю, якаснаму росту ў будучыні, у наступнай пяцігодцы, — падкрэсліла сенатар.

### Неацэнны вопыт

Падчас Форуму на прэзентацыйных пляцоўках можна было ацаніць рэальны вопыт работы па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Актывісты з розных раёнаў Гомельшчыны прадставілі праекты, прысвечаныя захаванню гістарычнай памяці і культурнай спадчыны, духоўна-маральных каштоўнасцяў, папулярызацыі здаровага ладу жыцця, экалогіі, добраўпарадкавання, бяспекі і іншыя. Адну з цікавых грамадзянскіх ініцыятыў прэзентаваў Акцябрскі раён. Іх праект — «Экалагічны парк пад адкрытым небам». Як растлумачыла **кіраўнік спраў райвыканкама, старшыня Акцябрскай раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Валянціна ШЛАПАКОВА**, праект — вынік сумеснай работы актывістаў грамадскіх аб'яднанняў, дэпутацкага корпуса, працоўных калектываў і арганізацый, неабыякавых жыхароў раёна.

— Ініцыятыва нарадзілася ў вельмі рамантычнай лакацыі — на месцы былой танцпляцоўкі. У савецкі час яна выкарыстоўвалася як месца сустрэч, спатканняў, правядзення розных мерапрыемстваў. Пасля распаду Савецкага Саюза побач вырас гарадскі стадыён, — распавяла Валянціна Шлапакова. — Летась мясцовыя жыхары выйшлі да дэпутацкага корпуса з ініцыятывай пераўтварыць тэрыторыю былой танцпляцоўкі ў месца адзінства, сустрэч. Сёлета, у Год якасці, мы якасна падышлі да гэтага пытання. Быў распрацаваны праект. На былой танцпляцоўцы зрабілі пакрыццё з сучасных матэрыялаў, занілавалі прастору. Пасля конкурсу сярод прадпрыемстваў, арганізацый, дэпутацкага корпуса і грамадскіх аб'яднанняў новае месца сустрэч упрыгожылі крэатыўнымі лаўкамі. У Беларусі 118 раёнаў, і сёлета мы высадзілі 118 дрэў і кустоў, што былі вырашчаны ў дэндрарыях лясніцтва Акцябрскага раёна. Дапамогу аказвалі ў тым ліку маленькія лесаводы з дзіцячага садка № 1. Месца адпачынку і сустрэч адрадзілася. Ініцыятыва будзе жыць, развівацца і ўдасканальвацца, — падкрэсліла Валянціна Уладзіміраўна.



На Форуме прэзентавалі грамадзянскую ініцыятыву Кармянскага раёна. Праект рэалізуюць на базе Кароцькаўскай сярэдняй школы Кармянскага раёна імя П. П. Качуеўскага. Гэта ініцыятыва прапануе вывучыць сучасныя спосабы вырошчвання раслін, а таксама заклікае папулярызаваць прафесіі сельгаспрофілю і рыхтаваць будучыя маладыя кадры для аграрнай сферы. Як расказаў дырэктар установы адукацыі Павел Уласаў, у школе даўно развіваюць экалагічны кірунак. Мясцовыя вучні вывучаюць прыёмы арганічнага земляробства, гідрапонікі, а засвоены матэрыял адпрацоўваюць на практычных занятках на вучэбнадоследным участку.

Праект грамадзянскіх ініцыятыў «Мае знакамітыя землякі: справа ўсяго жыцця», які стаў пераможцам адкрытага конкурснага адбору грамадзянскіх ініцыятыў, таксама прэзентавалі на Форуме. Ініцыятарам праекта выступіла ініцыятыўная група Махновіцкай сярэдняй школы Мазырскага раёна пры падтрымцы старшыні Махновіцкага сельвыканкама Васіля Канопліча і дэпутатаў Махновіцкага сельскага Савета дэпутатаў. У Мазырскім раёне менавіта гэты сельсавет — малая радзіма выдатных землякоў, прадстаўнікоў розных прафесій. Галоўная мэта праекта — праз знаёмства з гісторыямі жыцця землякоў, іх ролі для развіцця тэрыторыі малой радзімы выхаваць пачуццё павагі і любові да працаўнікоў вёскі ў падрастаючага пакалення. У музейнай экспазіцыі грамадзянскай ініцыятывы «Мае знакамітыя землякі: справа ўсяго жыцця» сабраны матэрыял пра гісторыю населенага пункта Махновічы, побыт вяскоўцаў, былы калгас «Прамень Кастрычніка», узнагароды за працоўныя заслугі землякоў.

— Гэты год нам паказаў, наколькі грамадзяне зацікаўлены ў паляпшэнні свайго населенага пункта і праяўленні сваёй грамадзянскай ініцыятывы. Як вядома, вельмі важна, што выдаткоўваюцца грашовыя сродкі, якія падтрымліваюць праекты грамадзянскіх ініцыятыў жыхароў нашага рэгіёна, — зазначыла **дырэктар Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Лілія ШАХЛЯНКОВА**.

### Падзяліцца рэальным вопытам

У праграме Форуму грамадзянскіх ініцыятыў прадугледзілі работу трох прэзентацыйных зон. Абмеркаваць ролю грамадзянскіх ініцыятыў у развіцці малых тэрыторый праз стварэнне турыстычных прадуктаў можна было разам з дырэктарам прыватнай установы «Тэрыторыя развіцця — XXI стагоддзе» Ірынай Багданец. Менавіта Ірына Іванаўна непасрэдна працавала з удзельнікамі адукацыйнага курса «Школа рэгіянальнага развіцця».

На адной з прэзентацыйных пляцовак удзельнікаў Форуму прывітала **старшыня праўлення Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА**. Дэпутат адзначыла, што Форум грамадзянскіх ініцыятыў, які ўпершыню ў такім фармаце арганізаваны на Гомельшчыне, у тым ліку дае магчымасць удзельнікам адукацыйнага курса «Школа рэгіянальнага развіцця» прадставіць свае праекты. Ініцыятары праектаў грамадзянскіх ініцыятыў, якія былі рэалізаваны на тэрыторыі Гомельскай вобласці, змаглі дзяліцца рэальным вопытам работы, абмяркоўваць цяжкасці, якія ўзніклі пры рэалізацыі праектаў, а таксама спосабы іх вырашэння.

— У рамках мерапрыемстваў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якія прайшлі ў чэрвені 2024 года ў Полацку, было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні паміж Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў і Асацыяцыяй «Савет муніцыпальных утварэнняў Бранскай вобласці», — нагадала Вікторыя Ладуцька. — Мы вельмі рады, што нашы госці з Бранскай вобласці знайшлі магчымасць наведаць Гомельшчыну, далучыліся да Форуму грамадзянскіх ініцыятыў, падзяліліся сваім досведам па станаўленні грамадзянскай супольнасці, развіцці мясцовых тэрыторый, заахвочванні дзелавой актыўнасці жыхароў, — падкрэсліла дэпутат.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота Гомельскай раённай газеты «Маяк».**

# Праз ініцыятыву да людзей

## У Магілёве дэпутаты і іх памочнікі ад насельніцтва абмеркавалі дзейнасць органаў самакіравання

**Удзел у выязным семінары на тэму «Арганізацыя дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў сучасных умовах» узялі дэпутаты, члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі органаў тэрытарыяльна-грамадскага самакіравання Магілёва і Бабруйска. У цэнтры іх увагі былі пытанні аб узаемадзеянні органаў мясцовага кіравання і самакіравання пры вырашэнні задач па жыццезабеспячэнні насельніцтва і супрацоўніцтве з органамі прафілактыкі правапарушэнняў для папярэджвання гібелі людзей у жылым фондзе. Удзельнікі семінара азнаёміліся з работай Саветаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразон Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Магілёва, наведалі сярэднюю школу № 24 імя К. М. Сіманава.**



Фота з сайта as-deputatov.by

На пленарным пасяджэнні дэпутаты абмеркавалі грамадска-палітычную сітуацыю ў Магілёўскай вобласці з улікам тых рэалій, якія існуюць на сёння, выпрацавалі сучасныя падыходы да арганізацыі інфармацыйна-тлумачальнай работы з насельніцтвам, акцэнтавалі ўвагу на такой эфектыўнай форме супрацоўніцтва з жыхарамі, як грамадзянскія ініцыятывы.

**Дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА** нагадала, што ў абласным цэнтры да 20 лістапада вядзецца прыём праектаў грамадзянскіх ініцыятыў для правядзення адкрытага конкурснага адбору. Найлепшыя з іх будуць падтрыманыя асацыяцыяй і прафінансаваныя. Але пры ўмове ўдзелу ў гэтым жыхароў — заяўнікоў ініцыятыў. Яны таксама павінны зрабіць свой унёсак.

— Актыўны ўдзел грамадзян у вырашэнні пытанняў мясцовага значэння — гэта аснова эфектыўнай работы мясцовай улады, — удакладніла Паліна Церашкова. — Праз такі ўдзел найлепшым чынам рэалізуецца патэнцыял мясцовага самакіравання. Цяпер час ініцыятыўных людзей, якім неабыякавая будучыня нашых рэгіёнаў і краіны ў цэлым. А значыць, вельмі важна развіваць эфектыўныя механізмы ўдзелу грамадзян.

Самакіраванне Магілёўскай вобласці прадстаўлена дэпутацкім корпусам усіх узроўняў, а таксама органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, у якіх задзейнічана больш як 10 тысяч чалавек. Гэта той асноўны актыў, які сёння дапамагае мясцовым органам улады ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва і развіцця тэрыторый.

Менавіта дзякуючы гэтай вялізарнай сіле, якая актыўна супрацоўнічае з насельніцтвам, у вобласці рэалізавана шмат грамадскіх ініцыятыў. Самым запатрабаваным кірункам на сёння з'яўляецца ўладкаванне дзіцячых гульнявых і спартыўных пляцовак. Найбольш буйныя праекты па добраўпарадкаванні такіх лакацый рэалізаваны ў 2022 годзе, дзякуючы пілотнаму праекту з удзелам Банка развіцця. У кожнай з ініцыятыў першы крок быў зроблены жыхарамі, але поспех кожнага прыкладу быў заснаваны на аб'яднанні намаганняў з мясцовай уладай.

— Толькі згуртаваўшыся і аб'яднаўшы намаганні, мы зможам вырашаць праблемы і супрацьстаяць выклікам і пагрозам, якія існуюць, — падвёў вынік работы семінара **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН**. — Разам мы зможам зрабіць наша жыццё лепшым, прыгажэйшым і камфортным.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ТЭОРЫЯ З ПРАКТЫКАЙ

## Рэгіянальныя семінары для старшынь раённых і сельскіх Саветаў праходзяць на Брэстчыне

**У Брэсцкай вобласці праходзяць выязныя семінары для старшынь раённых і сельскіх выканаўчых камітэтаў, якія былі выбраны на свае пасады ўпершыню. Як вядома, вучоба заўсёды была залогам паспяховай работы.**

**А кіраўнікам органаў мясцовага самакіравання асабліва важна спасцігаць нюансы па прымяненні асобных нормаў заканадаўства, асновы забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва. Важнымі выглядаюць не толькі тэарэтычная падрыхтоўка, але і наглядныя прыклады падыходаў да вырашэння таго ці іншага пытання. Акрэсленыя задачы заклікаcreateдаў вырашыць семінары, якія праходзяць у вобласці.**



Першы такі сход арганізавалі ў Ружанах: на вучобу сабраліся старшыні раённых і сельскіх Саветаў Івацэвіцкага, Баранавіцкага, Ганцавіцкага, Кобрынскага і Ляхавіцкага раёнаў. Прадстаўнікі Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, абласнога МНС, іншых ведамстваў пазнаёмілі прысутных з асаблівасцямі прымянення заканадаўства ў адпаведных галінах, адказалі на шматлікія пытанні.

Асноўным спікерам семінара выступіў **старшыня Пружанскага раённага Савета Мікалай КУДРАВЕЦ**. Кіраўнік прадстаўнічай улады раёна пазнаёміў з асноўнымі эканамічнымі, сацыяльнымі, культурнымі складальнікамі Пружаншчыны. Гаварылі аб новых рабочых месцах, рабоце па прыцягненні маладых спецыялістаў, аб развіцці інфраструктуры райцэнтра і вёсак.

На Пружаншчыне ёсць што паказаць і пра што расказаць калегам у плане работы органаў самакіравання. Напрыклад, у мінулым скліканні тут пачалі паспяхова практыкаваць правядзенне дзён Савета. Для арганізацыі мерапрыемства ў канкрэтным сельсавеце ствараецца некалькі рабочых груп райвыканкама па вывучэнні сітуацыі і выпрацоўцы рэкамендацый для мясцовай улады. Напрыклад, адна група вывучае добраўпарадкаванне, падтрыманне належнага стану на вытворчых аб'ектах, машынных дварах, на могілках, іншых аб'ектах. Другая група вывучае бяспеку ўмоў пражывання грамадзян, трэцяя маніторыць праблемы медыцыны і адукацыі, яшчэ адна цікавіцца работай гандлю, пошты, аддзяленняў банка. Групы, як правіла, узначальваюць намеснікі старшыні райвыканкама. Згаданыя намеснікі разам са спецыялістамі, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў вывучаюць работу кожнага аб'екта, гутараць з людзьмі, праводзяць маленькія нарады з кіраўнікамі прадпрыемстваў, што функцыянуюць на тэрыторыі. На некаторыя заўвагі ўдзельнікаў рабочых груп на месцах рэагуюць аператыўна, і недахопы ліквідуюцца ў рабочым парадку.

На пленарным пасяджэнні, якое і назвалі днём Савета, агучваюць вынікі работы груп, праводзяць аналіз стану спраў і выпрацоўваюць рэкамендацыі надалей. На пасяджэнне запрашаюць усіх старшынь сельскіх Саветаў раёна. За некалькі гадзін да пленарнага пасяджэння праходзіць прыём грамадзян.

На пленарнае пасяджэнне запрашаюцца таксама старасты вёсак, прыхозяць усе ахвотныя. Тут можна пачуць пра стан спраў сваёй тэрыторыі, задаць пытанні, даведацца пра тое, якія недахопы былі выпраўлены за час падрыхтоўкі да дня Савета. Па выніках дня Савета складаецца пералік мерапрыемстваў і неабходных спраў з тэрмінамі іх выканання і адказнымі асобамі. Наступны дзень Савета на іншай тэрыторыі пачнецца з таго, што кіраўнік папярэдняга выканкама паведамляе калегам, што зроблена з таго пераліку.

Гаспадары семінара — ружанцы — таксама змаглі падзяліцца цікавым вопытам работы. **Старшыня Ружанскага сельскага Савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ** расказала аб сваіх напрацоўках у плане добраўпарадкавання, сацыяльнага клопату. Удзельнікі семінара наведалі Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў, Цэнтр па рабоце з дзецьмі і моладдзю, гандлёвыя і іншыя аб'екты.

У Драгічынскім раёне падобны семінар правялі для кіраўнікоў сельскіх і раённых Саветаў Пінскага, Іванаўскага, Пружанскага, Бярозаўскага, Столінскага і Лунінецкага раёнаў. На семінары таксама выступілі спецыялісты і кіраўнікі розных ведамстваў. Удзельнікі наведалі Асавецкі і Папінскі сельскія Саветы. У Новай Папіне пабывалі ў лясніцтве, мясцовай школе, амбулаторыі. Удзельнікаў нарады зацікавіў вопыт рэалізацыі грамадзянскай ініцыятывы па добраўпарадкаванні могілак.

На сходзе жыхароў вёскі Зарэчка вырашылі прывесці ў парадак могілкі. Паводле слоў **старшыні сельскага Савета Святланы ДЫШКО**, гэта вёска вызначаецца не толькі працавітасцю, адказнасцю людзей, тут ёсць касцяк актывістаў, якія могуць падаць прыклад, апошняе вельмі важна. Яны і сталі ініцыятарамі сходу, на якім прымалася рашэнне. Адным словам, пасля сходу зборам грошай занялася жаночая суполка актывістаў. Адгукнулася пераважная большасць людзей. Патрэбную суму сабралі і купілі матэрыял на першую палову агароджы. Потым зрабілі і другую частку.

Але ж пачыналі з таго, што нанялі арганізацыю і прыбралі больш чым пяць соцень дрэў. Некаторыя дрэвы былі літаральна ў тры абхваты. Альпіністы іх папілавалі ды пакінулі на месцы. Усё гэта патрабавалася ачысціць ад галля, вывезці, прыбраць — таксама вялікая работа, потым спаліць, ачысціць тэрыторыю ад зараснікаў і хмызняку. Вяскоўцы актыўна працавалі. У працэсе работы знайшлі некалькі раней забытых магіл — партызан, мірных жыхароў, якія загінулі падчас вайны. Гэтыя пахаванні ўжо, відаць, няма каму дагледзець, таму іх акультурылі, крыжы паднавілі.

Цікавымі напрацоўкамі падзяліліся і ў Асавецкім сельскім Савеце. **Старшыня Брэсцкага абласнога Савета, сенатар Ігар БРЫЛЕВІЧ** падвёў вынікі семінара ў Драгічыне, акрэсліў кола задач органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прывёў прыклады падыходаў да вырашэння тых ці іншых пытанняў у справе жыццезабеспячэння насельніцтва.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота тэлеграм-канала Budni.by/Раённыя будні.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.771. Нумар падпісаны ў 19.30 5 лістапада 2024 года.

# КОД ПОСПЕХУ

## Як кампартыя прывяла Кітай да сусветнага лідарства



**Заўтра ў многіх краінах будзе адзначацца адметная дата — 107-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Падзея, якая аказала без перабольшання лёсавызначальны ўплыў на ўвесь свет, стала пераканаўчым доказам жыццяздольнасці камуністычнай тэорыі. Дасюль гэты глабальны фактар з'яўляецца дзейсным інструментам станоўчых пераўтварэнняў на карысць усяго грамадства. Яскравы прыклад — Камуністычная партыя Кітая, якая стала на чале гістарычнага шляху Паднябеснай з-пад каланіяльнага прыгнёту да сусветнага лідарства. Як гэта адбылося, чаму КПК дасюль застаецца ў авангардзе рэформаў?**

### Пераканаўчы падручнік

Сваё стагоддзе Камуністычная партыя Кітая адзначыла ў ліпені 2021 года (першы з'езд КПК прайшоў у Шанхаі 23 ліпеня 1921-га). Да гэтай даты было прымеркавана шмат урачыстасцяў. Адно з іх — адкрыццё ў пекінскім раёне Чааян грандыёзнага музейнага аб'екта — Выставачнага цэнтра гісторыі КПК. На плошчы 150 тысяч кв. метраў выстаўлена больш як шэсць тысяч найцікавейшых экспанатаў, якія адлюстроўваюць гісторыю Камуністычнай партыі Кітая — ключавыя падзеі са слаўнага мінулага і не менш велічнай сучаснасці, уключаючы архіўную фотаздымку з цырымоніі абвяшчэння Маа Цзэдунам Кітайскай Народнай Рэспублікі 1 кастрычніка 1949 года.

Сімвалічна, што тут удалося пабываць адразу пасля святкавання 75-годдзя ўтварэння КНР. Галоўны будынак музея ўзведзены ў форме кітайскага іерогліфа «гун» (рабочыя), і гэта падкрэслівае, што КПК з'яўляецца авангардам кітайскага рабочага класа. Многія будматэрыялы ўзяты з месцаў, якія маюць важнае значэнне ў гісторыі кампартыі. Напрыклад, камяні ў выставачнай зале музея, дзе прадстаўлены цудоўны лакавы жывапіс на тэму Вялікай Кітайскай сцяны, здабыты ў горадзе Яань правінцыі Сычуань на паўднёвым захадзе Кітая.

Тут прадстаўлены многія насамрэч унікальныя культурныя рэліквіі, у тым ліку — арыгіналы рукапісу Карла Маркса, рэдкія архіўныя фотаздымкі, а таксама змадэляваны сцэны надзвычай важных гістарычных падзей. «Гісторыя партыі служыць самым яскравым і пераканаўчым падручнікам», — падкрэсліў дырэктар музея У Сяндун. Паводле яго слоў, неабходна ў поўнай меры задзейнічаць каштоўнасць і ролю культурных рэліквій, звязаных з рэвалюцыйнымі традыцыямі КПК, і больш прадукцыйна выкарыстоўваць выставы па гісторыі партыі для прасоўвання адпаведных адукацыйных і асветніцкіх праграм.

Больш за ўсё тут экспанатаў, прысвечаных рабочаму класу, таму што менавіта ён стаў рухаючай сілай рэвалюцыі. Акрамя таго, узноўлены цэлыя экспазіцыі пэўных гістарычных момантаў. У пачатку экспазіцыі з павагай выстаўлены фігуры ў поўны рост Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса. Вельмі цікавыя стэнды з фатаграфіямі Маа Цзэдуна, на фота сярод яго паплечнікаў можна знайсці бацьку Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.






У асобнай зале паказваецца ролік, прысвечаны кітайска-японскай вайне, у якой пацярпела вельмі шмат кітайскіх грамадзян. Прычым транслюецца ён у 3D-праекцыі, каб наведвальнікі маглі адчуць сябе паўнацэннымі ўдзельнікамі тых падзей. Калі вакол ірвуцца снарады, паміраюць салдаты, прыходзіць разуменне таго, якой цаной дасталася перамога над ворагам. Гэтая вайна доўжылася 14 гадоў і была для Кітая вельмі цяжкай.

Напрыканцы найцікавейшай экскурсіі наведвальнікам прапануюць здзейсніць «Палёт над Кітаем», калі выкарыстоўваецца вялікі сферычны гіпербалічны экран у фармаце 8K, які дае гледачам магчымасць пагрузіцца ў незабыўную атмасферу. Дакладная імітацыя маланкі, дыму, дажджу, ветру і іншых эфектаў навакольнага асяроддзя, мадэліраванне перспектывы, вышыні, глыбіні і нават касмічных прастораў, Месяца, Марса дазваляюць стварыць рэалістычнае адчуванне і маштаб пераўтварэнняў у сучасным Кітаі.



Нядзіўна, што ўнікальны музей з моманту свайго адкрыцця прыняў больш за 3,5 мільёна наведвальнікаў. За гэты час было зарэгістравана больш чым 10 тысяч групавых наведванняў, а колькасць маладых наведвальнікаў дасягнула 550 тысяч чалавек.

### «Чырвоны» турызм

У Кітаі налічваецца звыш 1600 музеяў і мемарыялаў, прысвечаных яго рэвалюцыйнай гісторыі, адзначылі ў Нацыянальным упраўленні культурнай спадчыны КНР. У краіне зарэгістравана больш як 36 тысяч аб'ектаў рэвалюцыйнай спадчыны і агульная калекцыя з больш чым мільён звязаных з імі артэфактаў.

Развіццё «чырвоных» тураў у 2004 годзе было аб'яўлена прыярытэтнай задачай у турыстычнай сферы краіны. Тады ўлады вызначылі 10 найбуйнейшых турыстычных баз і 20 важных з гістарычнага пункту гледжання гарадоў, якія варта наведаць нашчадкам кітайскіх рэвалюцыянераў і замежным гасцям. Урад вырашыў ператварыць былыя апорныя базы камуністаў у цэнтры «чырвонага» турызму для прапаганды патрыятызму, умацавання нацыянальнага яднання і садзейнічання эканамічнаму развіццю старых рэвалюцыйных раёнаў.

Гэтая ініцыятыва знайшла водгук і падтрымку кітайскіх патрыётаў. Паступова «чырвоныя» туры сталі модным кірункам. Прасякнутыя рэвалюцыйнай рамантыкай групавыя вандроўкі па маршруце Вялікага паходу з кожным годам прыцягваюць усё больш людзей. Па самых сціплых ацэнках, штогод каля 50 мільёнаў чалавек наведваюць 150 галоўных цэнтраў «чырвонага» турызму, размешчаных у 13 правінцыях і гарадах цэнтральнага падпарадкавання, уключаючы Цзянсу, Хунань, Шэньсі і Чунцын.

Знакаміты цэнтр прыцягнення — пагранічны раён Шэньсі — Ганьсу — Нінся. Тут знаходзіцца легендарны горад Яньань, куды пасля знясільваючага Вялікага паходу прывёў свае войска Маа Цзэдун. У гэтых мясцінах мне пашчасціла пабываць летась. З 1935-га да 1948 года менавіта Яньань быў цэнтрам кантраляванага Кампартыяй Кітая раёна. Гэты горад у Кітаі называюць «калыскай рэвалюцыі». На паўночным захадзе Яньані, у пасёлку Цзааюань, шмат месцаў, звязаных са знаходжаннем кіраўнікоў КПК: Маа Цзэдуна, Чжоў Эньлая, Чжу Дэ і іншых.

На супрацьлеглым беразе мясцовай ракі Яньхэ, на гары Янцзялін, у пячорах размяшчаліся аддзелы ЦК КПК. Яны былі службовымі і жылымі памяшканнямі для кіраўнікоў кітайскай Кампартыі. Цяпер сюды пастаянна прыязджаюць шматлікія групы турыстаў. У наш час шматлікія турысты менавіта тут пазнаюць аб перыпетыях асабістага жыцця выдатных людзей Кампартыі. Гэтыя факты таксама шырока асвятляюцца ў папулярнай гістарычнай літаратуры, біяграфічных кінафільмах, тэлесерыялах. Усё гэта ўзбагачае сучаснае прачытанне кітайскай рэвалюцыі, напаўняючы яе новым займальным зместам.

Цікава, што цяпер у моладзі набірае папулярнасць атрыбутыка «чырвонага» турызму. Так, лічыцца стыльным падарожжа па месцах бітваў у адпаведнай экіпіроўцы — выцвілай форме і кепках-«маацзэдунаўках» з чырвонымі зоркамі. Гэту рэвалюцыйную атрыбутыку заўсёды можна набыць на «чырвоных» тураб'ектах, яе пастаўляе кітайская прамысловасць.

### Народ вышэй за ўсё

Напярэдадні 100-годдзя ўтварэння КПК выданне China daily пацікавілася ў кітайскіх экспертаў, у чым можа заключацца сакрэт паспяховасці КПК. Важным складнікам эфектыўнасці Кампартыі Кітая прафесар Партыйнай школы пры ЦК КПК Сун Сюнвэй назваў яе трывалую сувязь з масамі. Захаванне фокуса ўвагі на паляпшэнні жыцця простых людзей на працягу стагоддзя забяспечыла партыі найважнейшы фундамент у выглядзе даверу і павагі грамадзян. Непасрэдна ўнутры КПК такі строгі падыход да выбару прыярытэтаў дасягаецца праз пастаяннае самаачышчэнне і высокую самадысцыпліну, падкрэсліў эксперт.

Прафесар Партыйнай школы пры ЦК КПК Ху Інлянь заўважыў, што важным складнікам поспеху партыі з'яўляецца наяўнасць у яе разгалінаванай і шматузроўневай структуры. Дзякуючы гэтаму Кампартыя здольна эфектыўна размяркоўваць рэсурсы і мабілізаваць насельніцтва для вырашэння самых складаных задач. Як, напрыклад, было ў рамках барацьбы з эпідэміяй каранавіруса ў Кітаі ці падчас больш працяглага працэсу барацьбы з беднасцю ў краіне.

Хуэй Мін з Акадэміі грамадскіх навук Кітая падкрэсліў, што код поспеху ў тым ліку ва ўменні КПК аб'ядноўваць розныя гістарычныя этапы і іх культурную спадчыну. Кампартыя, нягледзячы на марксісцкую ідэалогію, не адмаўляецца і ад усёй астатняй пяцітысячагадовай кітайскай гісторыі. Такі падыход дазваляе спалучаць у грамадстве КНР сацыялістычныя і традыцыйныя каштоўнасці, якія гарманічна дапаўняюць адна адну.

Жыхары Паднябеснай часта кажуць: камяні мінулага — гэта прыступкі на шляху ў будучыню. Паднябеснай насамрэч удалося стварыць унікальны палітычны механізм, які не толькі спалучае ў сабе ключавыя тэзісы, закладзеныя яшчэ заснавальнікамі партыі, але і здольны змяняцца з улікам патрабаванняў часу. КПК згуртавала і прывяла шматнацыянальны народ Паднябеснай да адраджэння кітайскай нацыі, дабілася хуткага эканамічнага развіцця, доўгатэрміновай грамадскай стабільнасці і працвітання дзяржавы, а таксама дабрабыту людзей. Менавіта яна стварыла «кітайскі цуд» — феномен у гісторыі развіцця не толькі КНР, але і ўсяго чалавецтва, калі ўсяго за некалькі дзясяткаў гадоў аграрная краіна ператварылася ў індустрыяльную супердзяржаву.

У Кітаі ўжо многія дзесяцігоддзі забяспечваецца палітычная стабільнасць, захоўваецца пераемнасць улады. Сацыялізм з кітайскай спецыфікай уступіў у новую эпоху, а вялікае адраджэнне кітайскай нацыі дасягнула важнага пункта — усебаковай пабудовы сярэднезаможнага грамадства. Старшыня КНР Сі Цзіньпін адзначыў, што неабходна прытрымлівацца прынцыпу «народ вышэй за ўсё». Паводле яго слоў, у працэсе развіцця важна забяспечваць і паляпшаць дабрабыт насельніцтва і абараняць правы чалавека.

Прафесар Інстытута палітыкі і міжнародных адносін Цэнтральна-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта Юань Фанчэн пераканаены, што эфектыўнае кіраўніцтва і шырокае прадстаўніцтва Камуністычнай партыі Кітая паслужылі гарантыяй стабільнага палітычнага парадку і спрыяльнага асяроддзя для развіцця. Прафесар Партыйнай школы пры ЦК КПК Чэнь Шугуан лічыць, што адна з галоўных пераваг кітайскай палітычнай сістэмы заключаецца ў тым, што яна мае здольнасць да распрацоўкі доўгатэрміновых планаў развіцця і эфектыўнай рэалізацыі іх. Эксперт падкрэсліў, што КПК захоўвае паслядоўнасць у распрацоўцы палітыкі, адаптуючыся да зменлівых умоў у краіне і за мяжой.

Камуністычная партыя Кітая на момант свайго заснавання ў 1921 годзе налічвала крыху больш чым 50 членаў. Цяпер гэта найбуйнейшая кіруючая партыя ў свеце, у якую ўваходзяць 100 мільёнаў чалавек. Летась у КПК уступілі звыш 2,4 мільёна чалавек, больш за 80 працэнтаў з іх — грамадзяне ва ўзросце да 35 гадоў. Як раней заявіў выданню Global Times прафесар Пекінскага ўніверсітэта Чжан Іу, «КПК заваявала прызнанне сярод кітайскай моладзі. Яны бачаць, што краіна становіцца ўсё больш квітнеючай пад кіраўніцтвам партыі». Гэта будучыня Паднябеснай.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,**
**фота аўтара.**

*Мінск — Пекін — Мінск.*

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 09.10.2024 в г. «Звязда» № 197 (30331), стр. 15.**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Склад готовой продукции, корпус № 66, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/76 | 410 745,60 бел. руб. с учётом НДС | 205 372,80 бел. руб. с учётом НДС |

**Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) размещено 25.09.2024 в г. «Звязда» № 187 (30321), стр. 12.**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 2 | Кран опорный Г-П 2.0 ТН Л-6М с инв. № 2595, бывший в эксплуатации | 3 564,00 бел. руб. с учётом НДС | 2 376,00 бел. руб. с учётом НДС |
| 3 | Электрокран-Балка 3,2 Т с инв. № 29402, бывший в эксплуатации | 3 672,00 бел. руб. с учётом НДС | 2 448,00 бел. руб. с учётом НДС |

**Первые публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области.**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 4 | Подъемник с электролебедкой К-1, инв. 9595, бывший в эксплуатации | 3 600,00 бел. руб. с учётом НДС | 2 520,00 бел. руб. с учётом НДС |
| 5 | Люлька строительная ЛЭ-150-120, инв. № 9584, бывшая в эксплуатации | 4 200,00 бел. руб. с учётом НДС | 2 940,00 бел. руб. с учётом НДС |
| 6 | Мотоцикл С-3.901 (тележка самоходная), 2004 г. в., кузов (рама) № YEC39011030001119, регистрационный знак 3405 ТА, инв. № 9597 | 900,00 бел. руб. с учётом НДС | 630,00 бел. руб. с учётом НДС |

**Четвертые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) размещено 16.10.2024 в г. «Звязда» № 202 (30336), стр. 15.**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 7 | Дебиторская задолженность. Наименование дебитора: Акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва, Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт/пом/ком/оф 1/VII/АЗД, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012 г., ИНН: 7714887246, КПП: 771401001). | 9 153,41 росс. руб. без НДС | 6 407,39 росс. руб. без НДС |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **ООО «Индустрия Инноваций».**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов.

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги»: https://iintorgi.by.

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним.

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by.

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **1 %—4 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота.**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона).

**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лоту № 1—3, 7:** 21.11.2024 г. начало торгов — 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 06.11.2024 г. по 20.11.2024 г. до 16.00.
**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лоту № 4—6:** 09.12.2024 г. начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 06.11.2024 г. по 06.12.2024 г. до 16.00.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **тел: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

## ООО «ИПМ-Консалт оценка»

информирует
об отмене электронных торгов
по продаже имущества **производственного унитарного предприятия «Пищевой комбинат Белкоопсоюза»**
(публикация извещения в газете «Звязда» от 10.10.2024г.)

Тел.+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06, www.ipmtorgi.by

УНП 100166374

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г.Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Ленина, 46. УНП 100868495 |

**Предмет аукциона** (одним лотом)
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **литейный цех** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат.помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженер. корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус №4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). В состав лота входит иное имущество в количестве 36 единиц (подробный перечень на сайте организатора аукциона www.cpo.by).

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5.1481 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл, 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га).

**Обременения по лоту:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота расположено защит. сооружение ГО, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварит. договор аренды на часть кап. строения (инв. № 500/С-49698 (комната №4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2-х рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварит. договором о заключении договора аренды части кап. строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона.
Все вопросы, связанные с планами развития территории, на которой расположены объекты недвижимости, входящие в состав лота, а также перспективами их сноса и реконструкции, участник аукциона уточняет самостоятельно до начала аукциона в уполномоченных государ. организациях, ответственных за составление проектов детальной планировки данных территорий в соответствии с генпланом развития г. Минска.

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 29 538 178,62 бел. руб**. (снижена на 20 %).
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

**Задаток 1%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи: | **30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи.

Победитель аукциона, либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,12%** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.cpo.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.10.2024 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Дата и время проведения аукциона: 27.11.2024 г. в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512, ЗАО «Центр промышленной оценки». Дата и время окончания приема документов: 26.11.2024 г.** до 17.00 по тому же адресу.

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by**

## Информация о прямой продаже пустующих домов

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24.03.2021 г. №116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» ПРОДАЕТСЯ:

1.Одноэтажный бревенчатый жилой дом (оформлен) общей площадью жилых помещений 49 м. кв. с хозяйственными постройками, расположенный по адресу: аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 52 Березинского района Минской области на земельном участке 0,15 га.

Цена пустующего жилого дома: одна базовая величина 40,00 (сорок) белорусских рублей 00 копеек.

Претендентом на покупку пустующего жилого дома до истечения 30 календарных дней со дня опубликования сведений о прямой продаже пустующего дома предоставляется лично либо через своего представителя в Поплавский сельский исполнительный комитет (223334, Республика Беларусь, Минская область, Березинский район, аг. Поплавы, ул.Октябрьская, 12, poplavss@berezino.gov.by, телефон председателя (Сарнавский Алексей Михайлович) 8(017)15 63818, управляющего делами (Якушенко Анна Константиновна) 8(017)15 63821) следующие документы:

-заявка на покупку пустующего жилого дома по форме, установленной Государственным комитетом по имуществу;

-гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

-представителем гражданина – доверенность.

В случае поступления двух и более заявок от претендентов на покупку пустующего дома его продажа будет осуществляться по результатам аукциона.

УНП 600036561

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»

**«10» декабря 2024 в 14.00**
**проводит торги по продаже следующих объектов:**

| № п/п | Наименование объекта продажи | *Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей* | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | автомобиль ГАЗ 2705 (грузопассажирский вагон, 6 пассажирских мест, год выпуска — 2008, кузов № 27050090413471/ X9627050090637403 | 4560,00 (четыре тысячи пятьсот шестьдесят рублей 00 копейки) в т. ч. НДС 760,00 (семьсот шестьдесят рублей 00 копеек) | 456,00 (четыреста пятьдесят шесть рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:**
ОАО «Лента», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 65, Республика Беларусь, УНП 700002794, тел. для осмотра объектов продажи +375297411415.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам — предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах, фото объекта продажи размещены на интернет сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) —** в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся «10» декабря 2024 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к.112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – «09» декабря 2024 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов «10» декабря 2024 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона), оператор ЭТП** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Банк «РЕШЕНИЕ», УНП 100789114, ул. Игнатенко, д. 11, г. Минск, 220035, +375 (17) 369 73 88 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20%, в бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Нежилое изолированное помещение с инв. № 200/D-72310 общей площадью 73,6 кв. м., расположенное по адресу: г. Витебск ул. Я. Купалы, д. 9-1, назначение – помещение финансового назначения | 202 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций».**

**Шаг аукциона** – 5% процентов от начальной цены лота.

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций»: https://iintorgi.by.

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 5 (пять) дней** со дня заключения договора купли-продажи.

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by.

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 1 % от цены продажи лота.

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона).

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 06.12.2024 г., начало торгов — 10.00, окончание торгов — 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке: https://iintorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок:** | заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 05.12.2024 г. до 17.00. |
| **Контактные телефоны:** | **тел: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.



Скажыце, доктар...

# СТАРАСЦЬ У РАДАСЦЬ

## Як умацаваць здароўе ў пажылым узросце

**Калі вы на пенсіі ўжо працяглы час, але ўсё яшчэ не заняліся па-сапраўднаму сваім здароўем, раім гэта зрабіць, нават калі адчуваеце сябе здавальняюча. Запішыцеся на прыём да ўрача і раскажыце яму аб тым, што вас часам турбуе. Атрымаўшы рэкамендацыі, складзіце план аздараўлення і памятайце, што ваша выздараўленне залежыць не толькі ад доктара, але і ад вас асабіста.**

### Перагледзьце рэжым дня

Вырашыце раз і назаўжды, калі вам раніцай уставаць. Раней пад'ём быў у 6.30 раніцы, а цяпер будзе, напрыклад, у 7 гадзін. Карыстайцеся будзільнікам, нават калі вы некалі прывычаіліся ўставаць за пяць хвілін да яго званка. Паступова адвыкнеце. Ваш мозг перастане трымаць уначы «вартавы цэнтр», і вы будзеце адпачываць.

Не заседжвайцеся дапазна за чытаннем ці каля тэлевізара. Легчы апоўначы і спаць да васьмі — не тое ж самае, што легчы ў 22.30 і спаць да 6.30. Другі варыянт надасць бадзёрасці раніцай.

— Сон да паўночы ў тры разы карысней, чым пасля паўночы, пра гэта пастаянна гавораць спецыялісты і прыхільнікі здаровага ладу жыцця. Лепш, рана ўстаўшы, паспаць 1-1,5 гадзіны днём, пры гэтым не дапушчаючы думкі, што ўвечары вы не зможаце заснуць, — раіць **урач агульнай практыкі (загадчык) аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Святлана ЯНУШКА.**

### Гартаванне і фізічныя нагрузкі

Як толькі прачнуліся, выканайце свой комплекс ранішняй гімнастыкі. 10—15 хвілін практыкаванняў лежачы — выдатная абарона ад прастуды, пасля адразу ўставайце. Пажадана час ад часу ўводзіць у адпрацаваны ўжо комплекс 1-2 новыя практыкаванні, якія падаюцца вам карыснымі і ў дапамогу якіх вы верыце.

— Вядома, можна дазволіць сабе паспаць крышачку даўжэй, але доўгае залежванне ў ложку пасля прабуджэння заахвочвае ляноту, знікае бадзёрасць і энергію, — нагадвае ўрач. — І галоўнае, гэта вера — у практыкаванне, лекі, дыету, урача, яна ўзмацняе лячэбны эфект.

Толькі пасля зарадкі, прыняўшы душ альбо зрабіўшы абціранне, сядайце снедаць. Часу ў вас шмат, так што ешце павольна, хвілін на 7—10 даўжэй, чым раней. Калі ў вас лішняя вага і павышаны апетыт, рабіце перапынкі: камунебудзь патэлефануйце, зірніце на тэрмометр за акном, уключыце радыё. Паспрабуйце не глядзець за ежай тэлевізар. Прымайце ежу, адчуваючы ўсе смакі. Пасля сняданку пазбягайце сну і дадатковага адпачынку, асабліва пры лішняй вазе. Карысна здзяйсняць ранішнія прагулкі. Калі ёсць сабака, адпраўляйцеся з ім на вуліцу.



Заўсёды знаходзьце сабе дома нейкую работу: прыбірацца, шыць, хадзіць у краму. На жаль, усе гэтыя справы не дастаўляюць задавальнення. Вось чаму так неабходна знайсці хобі — прыемны, не надакучлівы вам занятак-забаўку, які вы спынялі б толькі тады, калі стоміцеся ці калі вас адарве ад яго нешта важнейшае.

### Карысць свежага паветра

Абавязкова выдаткоўвайце час для знаходжання на паветры — па 1,5-2 гадзіны два разы на дзень, некаторым падыходзіць аднаразовая прагулка на працягу 3-4 гадзін. Гуляць лепш за ўсё ў лесе, парку, садзе. Там, дзе няма вялікай колькасці транспарту і шмат чыстага паветра. Старайцеся штодзень падымацца па лесвіцы хоць бы на 2-3-і паверхі, калі можаце, то і на 4-ы, а ў ідэале — 1-2 разы на 5—7-ы паверхі. Паступова падаўжайце дыстанцыю: не бойцеся, што сэрца заб'ецца крыху мацней — яму карысныя ўмераныя нагрузкі, але не перагрузкі. Пры неабходнасці адпачывайце пасля кожнага марша: пастаялі на пляцоўцы — рушылі далей. Вашымі кантралёрамі будуць нармальнае самаадчуванне, нармальны сон і добры настрой. Калі ўсё ў парадку, значыць, нагрузка не была празмернай. Не забывайце наведваць урача, які паслухае сэрца, памерае ціск і дасць рэкамендацыі.

### Вядзіце актыўны лад жыцця

Вольны ад работы час дазваляе вам часцей хадзіць на выставы, у музеі, пачаць наведваць тэатры. Развівайце ў сабе пачуццё гумару, імкніцеся слухаць радыё, глядзець па тэлевізары камедыі, вясёлыя прадстаўленні — нават калі вы іх ужо бачылі. Вельмі добра загадзя купіць білет у тэатр. Плануючы туды пайсці, вы настройваецеся на атмасферу тэатральнай залы. Вядома, адзецца трэба як на ўрачыстасць да лепшага сябра, і вы будзеце адчуваць сябе больш упэўнена, бо заўсёды прыемна быць у грамадстве.

### Спрыяльны рэжым адпачынку і сну

Шляхам апрабавання розных варыянтаў знайдзіце аптымальны для вас рэжым начнога сну. Абавязковая ўмова начнога сну — гэта свежае паветра, таму пажадана адкрываць фортачку. Калі халадна, уцяпліцеся, але дыхайце свежым паветрам. Для арганізма чалавека, акрамя правільнага харчавання і руху, важна таксама і расслабленне.

Карысныя розныя водныя працэдуры: душ, абліванне або абціранне. Гэта і гімнастыка для сасудаў, скуры, і выдатны спосаб загартоўвання, і крыніца дабратворных стымулаў для ўнутраных органаў. Пасля зарадкі і водных працэдур вы павінны адчуць сябе нашмат лепш. А калі раптам самаадчуванне пагаршаецца, значыць заняткі трэба спыніць, а праз некалькі дзён аднавіць, але зменшыць іх інтэнсіўнасць. Можна параіцца з урачом адносна комплексу аздараўленчых мерапрыемстваў для вашага арганізма.

---

Карысна ведаць

# І МЫШ НЕ ПРАСКОЧЫЦЬ

## Як пазбавіцца ад няпрошаных гасцей?

**Восень — той час, калі грызуны імкнуцца пракрасціся ў дамы і пабудовы ў пошуках ежы і цяпла. І калі ў вядомай казцы мышка — бяскрыўдная памочніца ва ўборцы ўраджаю, то ў жыцці — гэта шкоднік харчоў, маёмасці і пераносчык такіх небяспечных захворванняў, як шаленства, лептастыроз, іерсініёз, тулярэмія, сальманелёз, дызентэрыя, гельмінтозы і многія іншыя. Узбуджальнікі інфекцый могуць трапляць у арганізм чалавека пры ўжыванні забруджаных прадуктаў харчавання, удыханні пылу, які змяшчае вылучэнні грызуноў, пры трапленні свежых экскрэментаў, мачы, сліны грызуноў у ранкі і драпіны на скуры. Якія ж існуюць спосабы пазбавіцца ад нязваных гасцей? Пра іх расказала інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.**

### САМЫ ТАННЫ СПОСАБ

Калі мышы знойдуць адтуліну, шчыліну ці магчымасць падкапацца пад хату, яны пастараюцца пракрасціся ўнутр памяшкання. Таму неабходна праверыць сцены, падлогі і дахі на наяўнасць расколін і адтулін, праз якія могуць пранікаць грызуны. Замуруйце іх цэментам, металічнымі сеткамі ці іншымі матэрыяламі.

Калі мышы ўсё ж сталі вашымі няпрошанымі гасцямі, пазбавіцца іх можна некалькімі спосабамі. Найперш гэта механічныя пасткі. У залежнасці ад прынцыпу дзеяння яны дазваляюць злавіць мыш у жывым або ў мёртвым выглядзе. Лепш выкарыстоўваць адразу некалькі пастак рознага тыпу. Гэта дасць больш шанцаў злавіць усіх мышэй, бо некаторыя грызуны могуць ведаць, як пазбегнуць пастак.

Сённяшнія прадаюцца і клеявыя пасткі. Яны ўяўляюць сабою кардонную, папяровую, радзей пластыкавую падставу і ліпкі клеявы пласт. У цэнтр змяшчаецца прынада. Мыш, якая трапіла ў клей, не можа вызваліцца і гіне ад абязводжвання. Недахоп спосабу ў тым, што пастка лічыцца аднаразовай. Яе даводзіцца выкідваць разам з мышшу.

### УЛЬТРАГУК І ЯДЫ

Адным з найбольш гуманных спосабаў з'яўляюцца ўльтрагукавыя ці электрамагнітныя адпужвальнікі грызуноў. Прыбор генеруе электрамагнітныя ці ўльтрагукавыя хвалі, якія ўздзейнічаюць на нервовую сістэму грызуноў. Такім чынам ствараюцца непераносныя для гэтых жывёл умовы пасялення, і шкодныя суседзі сыходзяць у іншае месца.

У некаторых месцах найлепшым спосабам ад грызуноў будуць яды. Асартымент прэпаратаў у цяперашні час вельмі разнастайны. Атрутныя прынады выпускаюцца ў выглядзе цеста-брыкетаў, збожжавых прынад, васковых брыкетаў або таблетак, гранул, гелю-канцэнтрату. Па назіраннях пацукі больш ахвотна паглынаюць мяккія кавалачкі цеста-брыкету. А вось мышы часцей грызуць збожжавую прынаду. Васковыя таблеткі ідэальна падыходзяць для барацьбы з грызунамі ў садзе, агародзе, у склепе, у сырых і вільготных месцах.

Пры выкарыстанні атруты для мышэй важна правільна абраць месцы для размяшчэння атрутных прынад. Прэпараты раскладваюцца на кардонныя падкладкі, бляшаныя вечкі, у невысокія слоікі і латкі. Расстаўляюцца каля нор, уздоўж сцен і «сцежак» з памётам праз 2-4 м невялікімі порцыямі. Прынады варта рэгулярна правяраць і папаўняць.

Яды вострага дзеяння выклікаюць гібель грызуноў пасля аднаразовага паглынання прынады. Аднак з хуткім развіццём працэсу атручэння звязана і ўзнікненне насцярожанасці ў грызуноў, адмова ад паўторнага паядання атрутнага пачастунку.

Яды хранічнага (кумулятыўнага) дзеяння назапашваюцца ў арганізме жывёлы і паступова прыводзяць да яго гібелі. З прычыны павольнага развіцця атручвання грызуны не звязваюць хваравітых адчуванняў з паглынаннем прынады і насцярожанасці да гэтых прэпаратаў не праяўляюць.

Вельмі важна пастарацца абмежаваць доступ мышэй да вады. Вадкасць спрыяе выдаленню таксінаў з мышынага арганізма, акрамя таго, вада для грызуноў — абавязковая ўмова для пражывання. Калі няма доступу да вады ці сакавітага корму, грызуны гінуць на працягу 4-5 дзён.

Выкарыстоўваць атрутныя прынады варта з асцярожнасцю, ужываючы пры рабоце сродкі індывідуальнай абароны:



пальчаткі, рэспіратар, ахоўныя акуляры. Каб абмежаваць кантакт з прэпаратам свойскіх жывёл, рэкамендуецца выкарыстоўваць спецыяльныя кантэйнеры — прынадныя домікі. Таксама трэба памятаць, што мёртвая мыш пакідае пасля сябе непрыемны пах.

### КОШКІ-МЫШКІ

Добрым сродкам барацьбы з мышамі застаецца кошка. Сам пах хатняга драпежніка выклікае ў мышэй страх і прымушае іх шукаць іншае месца для зімоўкі. Аднак кот лёгка справіцца з 1-2 мышамі, але калі ў хаце іх цэлае полчышча, то наўрад ці ў вашага сябра хопіць сіл пераловіць іх усіх. Акрамя таго, не кожная кошка стане лавіць мышэй. Ганарлівая гарадская, распешчаная кормам з пакеціка жывёла хутчэй аддасць перавагу пакачацца на падушцы, чым ганяцца за мышшу.

### НАРОДНЫЯ МЕТАДЫ

Мышы не любяць рэзкіх пахаў і раслін, якія непрыемна пахнуць. Паспрабуйце выкарыстоўваць для адпужвання грызуноў рыззё, прамочанае газай, шкіпінарам, бярозавым дзёгцем або маззю Вішнеўскага, раскладаючы яго ў скляпах і падполах, на гарышчы, у адрынах і гаражах. З раслін адпудзяць грызуноў дапамогуць перачная мята, багун, каляндра, бузіна, піжма, палын.

Калі праблема становіцца занадта сур'ёзнай, магчыма, варта звярнуцца да спецыялістаў па дэратызацыі (барацьбе з грызунамі). Яны змогуць правесці больш дакладны аналіз сітуацыі і прапанаваць найбольш прыдатныя метады барацьбы.

Жыхарам шматкватэрных дамоў пры з'яўленні няпрошаных гасцей трэба звярнуцца ў арганізацыю, на абслугоўванні якой знаходзіцца дом (ЖЭС, ЖЭУ, ТС і інш.). Менавіта яны арганізуюць правядзенне дэратызацыйных мерапрыемстваў.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (1 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-429 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная № 1, общая площадь – 33,9 кв. м) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/2 | 2179572,13 | 21795,72 | 108978,61 |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-427 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад для хранения готовой продукции, общая площадь – 24,2 кв. м) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/3 | | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-430 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная № 2, общая площадь – 32,5 кв. м) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/4 | | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-428 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная, общая площадь – 468 кв. м, составные части и принадлежности – дымовая труба) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/1 | | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-431 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – вспомогательный корпус реммастерской, общая площадь – 1770,1 кв. м, составные части и принадлежности – семь пристроек, холодная пристройка) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А | | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-432 (назначение – сооружение специализированное иного назначения, наименование – площадки, проезды, ограждения, общая площадь – 0 кв. м) | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/5 | | | |
| | Имущество, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/1-o8gOmzZxX2ulZZ5SFwfJDpbpqLhFSf8/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А; Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3А/1 | | | |

В отношении лота проводятся первые торги.

В отношении частей лота имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Приорбанк»). Подробная информация по телефону +375293110464.

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 123450100001000819, площадью 3,1938 га, назначение – земельный участок для обслуживания строений и сооружений. Право постоянного пользования.

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **9 декабря 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1127 |
| Срок приема заявлений и внесения суммы задатка | С 10:00 6 ноября 2024 года до 16:00 5 декабря 2024 года |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 09.12.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 1 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи в рассрочку на один год ежемесячно равными долями.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375333031971 Ермошкевич Евгений Васильевич**; **+375295295202 Сергей**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| Информация о продавце | ООО «Профитсистем» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375(17)3958917 (220040 г. Минск, ул. Достоевского, 27) |
| Организатор аукциона | ООО «Фрондера», 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 • тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg |

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует

**о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимости — здания Поста электрической централизации, находящегося в собственности Республики Беларусь и хозяйственном ведении РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»**

**Дата проведения аукциона: 20 ноября 2024 г. в 10-00.**
**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7.**

| № лота | Наименование объекта аренды, цель его использования | Арендуемая площадь, (м$^2$) |
|---|---|---|
| 1 | **Здание Поста электрической централизации, инв. № 342/С-67147** (для организации розничной торговли, размещения офиса организаций и т. п.) | 150,9 |

**Местонахождение объекта аренды:** Гомельская обл., Светлогорский р-н, Осташковичский с/с, д. Останковичи, ул. Железнодорожная, 26Б.

**Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 670,00 рублей. Задаток: 670,00 рублей.**
**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **3,0.**
**Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %.**

**Местонахождение организатора аукциона, его контакты:** г. Гомель, ул. Артёма, 23, т.: +375 232 32-46-47, 32-18-95, +375 29 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by.

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 05.11.2024 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

**Лот №1:**
1) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22066 (наименование: домик овощевода инв. № 319; назначение: здание специализированное растениеводства) площадью 78,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4/1, 0.2 км западнее аг. Кожан- Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000082, площадью 0,2913 га;
2) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22145 (наименование: административное здание инв. № 009; назначение: здание административно-хозяйственное) площадью 563,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4, 0.2 км западнее аг. Кожан- Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000082, площадью 0,2913 га

| Начальная цена, руб. | 1 (одна) базовая величина - 40,00 рублей | Размер задатка, руб.: | 1 (одна) базовая величина — 40,00 рублей |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО "Дворецкий", Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Дворец, ул. Школьная, 3, тел./ф 8(016)4793432.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 8(016)2408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/сч для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
Срок возможного отказа от проведения аукциона: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.
Условия продажи: при продаже недвижимого имущества на аукционе с начальной ценой, равной одной базовой величине, одним из обязательных условий такого аукциона является:
осуществление покупателем предпринимательской деятельности (в том числе деятельности по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма, ремесленная деятельность либо деятельность, при осуществлении которой физические лица, не осуществляющие предпринимательскую деятельность, уплачивают единый налог) с использованием приобретенного недвижимого имущества и (или) построенного после его сноса в течение двух лет, начиная не позднее двух лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;
реконструкция под жилые помещения или перевод в жилое помещение без реконструкции, или снос и возведение жилых помещений на месте приобретенного имущества, или использование приобретенного имущества для ведения личного подсобного хозяйства. В случае использования права сноса приобретенного объекта и строительства нового объекта, либо сноса отдельных объектов, входящих в состав приобретенного недвижимого имущества, которые не могут быть использованы – не позднее пяти лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта. В целях использования данного права не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Ляховичский районный исполнительный комитет для получения разрешительной документации на снос, а также на проектирование и строительство нового объекта (при необходимости). Осуществить снос и строительство в порядке и в сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией;
запрещение отчуждения, передачи без перехода права собственности, залога приобретенного объекта (построенного нового, реконструированного) до выполнения покупателем условий договора купли-продажи, за исключением случаев его отчуждения, передачи без перехода права собственности юридическому лицу, собственником имущества, учредителем (участником) которого является покупатель, и принявшему на себя все обязательства и ответственность путем заключения дополнительного соглашения о внесении соответствующих изменений в договор купли-продажи.

**Аукцион состоится 9 декабря 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 6 декабря 2024 г. до 17.00**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел.: +375 (17) 310-36-37 |
| **Продавец** | РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ». УНП 101127633. 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14а. Тел. +375 (17) 275 75 23. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. Тел.: +375 (17) 373-21-33, адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов:**

**Торговое помещение, инв.№ 500/D-708179937, общ.пл. 2878.1 кв.м., по адресу г. Минск, тр-т Игуменский, 16-388.**
В состав лота входит иное имущество: система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре с инвентарным номером 2748, система водяного пожаротушения и система автоматизации с инвентарным номером 2749, система охранной сигнализации с инвентарным номером 2751, система контроля доступа с инвентарным номером 2753, система холодоснабжения с инвентарным номером 2756.

**Начальная цена лота (с НДС 20%) – 8 179 347,14 бел. рублей.**
Шаг торгов – 408 967,36 бел.рублей.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11:00 до 11:10 25.11.2024 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by до **22.11.2024 г. до 17.00.**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/) и Минского городского исполнительного комитета (https://minsk.gov.by/) от 06.11.2024 г.

**Контактные телефоны**: +375(17)310-36-37; +375(29)154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 19.11.2024 г.**

**Лот № 1 в составе:** капитальное строение (инв. № 710/С-42276), площадь – 6,3 кв.м. Земельный участок № 741000000007002389, 0.0046 га. Право постоянного пользования; Изолированное помещение (инв. № 710/D-72814), площадь – 1452 кв.м. Земельный участок № 741000000007002387, 1.1323 га. Право аренды. Срок действия с 03.04.2013 г. по 01.03.2112 г.; Изолированное помещение (инв. № 710/D-72815), площадь – 1241.7 кв. м. Земельный участок № 741000000007002387, 1.1323 га. Право аренды. Срок действия с 03.04.2013 г. по 01.03.2112 г.
Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 185

**Лот № 2:** Изолированное помещение (инв. № 710/D-55740), площадь – 238.2 кв.м. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 185-6. Земельный участок № 41000000007002388, 0.0946 га. Право аренды. Срок действия с 21.02.2012 г. по 01.01.2110 г.

**Лот № 3:** Изолированное помещение (инв. № 710/D-55743), площадь – 430.1 кв.м. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 185-7. Земельный участок № 41000000007002388, 0.0946 га. Право аренды. Срок действия с 21.02.2012 г. по 01.01.2110 г.
Начальная цена с НДС 20 %: лот № 1 – 339 589,87 долларов США, задаток – 111 945,80 руб; лот № 2 – 20 293,47 долларов США, задаток – 6 689,74 руб; лот № 3 – 40 666,68 долларов США, задаток – 13 405,77 руб. **Шаг электронных торгов** – 2 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 14.11.2024 г. в 16.00.

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» сообщает

об ОТЗЫВЕ ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

опубликованной в газете «Звязда» 21.10.2023 г. № 205 (30085)

(о строительстве объекта **«Квартал жилой застройки в районе ул. Выготского в г. Минске». Жилой дом №15 по генплану)** в связи с приостановлением строительства.

УНП 100071325

«Свидетельство о государственной регистрации и печать общества с ограниченной ответственностью «Лидердом» (УНП 192779102) считать недействительными в связи с утерей».

Кніжны гасцінец

# «А было ж Стрэчанне...», альбо Як абысціся без сімулякраў

**Т. І. Кухаронак. Святочны час. Народныя звычаі і павер'і ў аповедах беларусаў.**



*«Колькі я ў прафесіі, столькі ж пастаянна адчуваю ўдзячнасць вясковым людзям, з якімі даводзілася мець зносіны падчас нашых фальклорна-этнаграфічных экспедыцый. Яны шчодра дзяліліся з навукоўцамі сваімі ведамі, каштоўнасць якіх часцей за ўсё і не ўсведамлялі. А пасля гэтая інфармацыя станавілася асноўнай крыніцай для напісання нашых кніг, артыкулаў, дысертацый. Вось і ў гэтай кнізе прадстаўлены аповеды вясковых жыхароў, запісаныя ў апошнія 10—20 гадоў, іх успаміны, эмоцыі, хваляванні, звязаныя са святамі народнага календара...»* — піша ў прадмове аўтар, вядомы этнолаг Тацццяна Кухаронак. Усяго для кнігі, якая пабачыла свет у выдавецтве «Беларуская навука», адабраны запісы ад 232 інфармантаў з 67 раёнаў Беларусі. І гэта вельмі каштоўна, што запісы нядаўнія, — адказ тым, хто сцвярджае, што фальклор адмірае і нават у вёсцы нічога не памятаюць... Памятаюць! І пра ўшанаванне продкаў, і пра Грамніцы і Дзявятнік, пра Калядных цароў і Юр'я, Русальны тыдзень і варажбу на Шчодры... У кнізе гучаць жывыя, неадаптаваныя галасы з усіх куткоў краіны, з захаваннем асаблівасцяў мясцовай гаворкі. *«Помню малая была, заставілі на речке, халадзільнікаў жа не было, заставілі на речке ў карыце халадзец студзіць. Эта перад Тройцай. Вечарам жа гулянне! Вяду тую пераліваеш туды-сюды, палец уткнеш, папробуеш — гарачая яшчэ. Аняць пераліваеш, каб застываў той халадзец»,* — распавядае Ганна Міхалькова з вёскі Кісялёва Буда Клімавіцкага раёна Магілёўшчыны. *«А было ж Стрэчанне, гукалі вясну... І мы нарадзім, накрасім бумагі, ланцужкоў наробім, кветак, пеўнікаў такіх наверх і маленькую зрубаем сасну, усе гэтыя ўборы бумажныя навесім на сасну»,* — успамінае Вольга Касцюкевіч з вёскі Сіманічы Лельчыцкага раёна Гомельшчыны. У расповедах вяскоўцаў адлюстроўваюцца ўсе перыпетыі гісторыі, што давялося перажыць людзям, якія, нягледзячы ні на што, трымаліся традыцый продкаў.

Маштаб зробленага аўтарам уражвае. Расповеды рэспандэнтаў суправаджаюцца яе каментарыямі, таксама жывымі, неабыякавымі. Дапаўняецца ўсё фотаздымкамі, на якіх можна ўбачыць фрагменты народных абрадаў, аблічча іх носьбітаў, унікальныя артэфакты, прыкладам, прыстасаванне для качання велікодных яек. Думаецца, кожны беларус знойдзе ў гэтай кнізе сведчанні пра свае родныя мясціны і яшчэ раз упэўніцца, наколькі багатая нацыянальная культура.

**Жан Бодрийяр. Общество потребления.**



Сёння вельмі модна ўжываць тэрміны «гіперрэальнасць» і «сімулякр», хоць часта гэта робяць не зусім усведамляючы сэнсу... А з'явіліся яны дзякуючы філосафу Жану Бадрыяру, аднаму з заснавальнікаў постмадэрнізму. Філосаф крытычна ставіўся да сучаснага глабалісцкага грамадства, дзе галоўным сталі матэрыяльныя набыткі. Эра спажывання — эра адчужэння, сцвярджае ён. Супершопінг-цэнтр — тое, у што спрабуюць ператварыць нашу цывілізацыю, дзе будуць немагчымыя болей мара, паэзія, развага... Чаму просты чалавек, не самы багаты, траціць свае рэсурсы на не вельмі патрэбныя рэчы, імітацыю брэндавых, у набыцці якіх бачыць сэнс жыцця? Бадрыяр ілюструе гэта тэза прыпавесцю: меланезійскія тубыльцы былі зачараваныя самалётамі, якія пралягалі над імі. Але ніколі гэтыя прадметы да іх не спускаліся. Туземцы лічылі, што белыя людзі змаглі займець гэтыя чароўныя прадметы, бо размяшчалі ў некаторых месцах на зямлі падобныя прадметы, якія і прывабілівалі самалёты з неба. Таму тубыльцы пачалі рабіць падабенства самалёта з галін і ліян, вылучылі ўчаст予 зямлі, якія старанна асвятлялі ноччу, і пачалі цярпліва чакаць, пакуль сапраўдныя самалёты там прызямляцца.

Гэтак робіць і сучасны чалавек, які «палюе» ў «джунглях горадоў»: *«У чаканні цуда ад спажывання такі паляўнічы таксама прыводзіць у дзеянне прадметы-сімулянты, характэрныя знакі шчасця і затым чакае (безнадзейна, сказаў бы мараліст), што шчасце прыйдзе само».* Ну памятаеце рэкламу, калі жанчына мые валасы пэўным шампунем, а пасля да яе з'яўляецца прынц на белым «лексусе»? У аснове — усё тое ж дзікунства, першабытная магія... Ці так далёка мы адышлі ад забабонных продкаў? Пачытайце Бадрыяра, падумайце... Трактат «Грамадства спажывання» з'явіўся ў 1970 годзе, але, здаецца, робіцца ўсё больш актуальным. У чым сутнасць індустрыі высокай моды і індустрыі прыгажосці? Што такое кітч? Як з пункту гледжання філасофіі асэнсаваць гаджэт і гульнявыя паводзіны? Яшчэ да з'яўлення камп'ютарных гульняў і смартфонаў Бадрыяр прадказваў, што «гаджэт акажацца ісцінай аб'екта ў грамадстве спажывання, і на гэтай падставе ўсё можа стаць гаджэтам і ўсё ім патэнцыйна з'яўляецца. Нічога больш карыснага, нічога больш бескарыснага: сама тэхнічная навінка становіцца гаджэтам, калі тэхніка аддадзена ў распараджэнне разумовай практыкі магічнага тыпу ці грамадскай практыкі моды». Ну дакладна ж пра нас сказана, ці не так?

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

*Выдадзены для агляду прадастаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.20 | 17.25 | 9.05 |
| Віцебск — | 8.14 | 17.11 | 8.57 |
| Магілёў — | 8.10 | 17.15 | 9.05 |
| Гомель — | 8.02 | 17.17 | 9.15 |
| Гродна — | 8.34 | 17.42 | 9.08 |
| Брэст — | 8.30 | 17.47 | 9.17 |

### Месяц

*Маладзік 1 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксея, Апанаса, Івана, Мікалая, Пятра.*
***К.** Хрысціны, Леанарда, Фелікса.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ЗАЎТРА




## 6 ЛІСТАПАДА Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1384** год — войскі Ягайлы і Вітаўта аблажылі і спалілі тэўтонскі замак Новы Марыенвердэр, адзін з першых заснаваных Тэўтонскім Ордэнам у Прусіі.

**1800** год — нарадзіўся (в. Аборак, цяпер — Маладзечанскі раён) Леанард Ходзька, беларускі гісторык, публіцыст, выдавец. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Член таварыства філарэтаў, у якім ён зблізіўся з Адамам Міцкевічам, Янам Чачотам, Тамашам Занам. З 1819 года — сакратар кампазітара М. К. Агінскага. Аўтар паэмы «Залессе», у якой услаўляў прыгажосць Смаргоншчыны, зрабіў малюнкі маёнтка Агінскага ў Залессі. Выдаў зборнікі твораў А. Міцкевіча і І. Красінскага, мемуары М. К. Агінскага, працы па гісторыі, геаграфіі, статыстыцы. Сабраў 125 тамоў дакументаў па гісторыі Польшчы, Беларусі, Украіны і інш.

**1842** год — у Горы-Горках пры земляробчай школе заснаваны батанічны сад, адзін з найстарэйшых у Беларусі. Сёння ён выконвае функцыю для практычных заняткаў студэнтаў па прадметах «Батаніка», «Лесаводства», «Садоўніцтва». Адной з галоўных экспазіцый саду з'яўляецца дэндрарый, які пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя аб'яўлены батанічным помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Батанічны сад аб'яўлены гісторыка-культурнай каштоўнасцю цэлага комплексу БДСГА. Плошча яго цяпер складае восем гектараў.

**1992** год — Нацыянальны банк Беларусі вырашыў весці грашовы разлік на тэрыторыі краіны толькі ў беларускіх рублях.

У свеце

**1851** год — нарадзіўся Чарльз Генры Доў, амерыканскі журналіст, сузаснавальнік Dow Jones & Company, стваральнік Прамысловага індэкса Доў Джонса.

**1852** год — нарадзіўся Дзмітрый Мамін-Сібірак, рускі пісьменнік-празаік і драматург. У шырокую літаратуру ўвайшоў серыяй дарожных нарысаў «Ад Урала да Масквы». Першым буйным творам пісьменніка стаў раман «Прывалаўскія мільёны», які меў вялікі поспех. У 1884 годзе ў часопісе «Отечественные записки» з'явіўся раман «Горнае гняздо», які замацаваў за Маміным-Сібіракам рэпутацыю выдатнага пісьменніка-рэаліста.



**1860** год — Абрахам Лінкальн абраны прэзідэнтам ЗША. Ён стаў першым рэспубліканцам на гэтай пасадзе.

**1941** год — зварот І. В. Сталіна да савецкага народа, даклад на ўрачыстым пасяджэнні перад парадам войск Чырвонай Арміі 7 лістапада на Краснай плошчы ў Маскве.

**1943** год — Вялікая Айчынная вайна: савецкія войскі вызвалілі Кіеў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Так гаварыў...

**СВЯТОНІЙ**:

*«Хто не асуджае паклёпнікаў, той натхняе іх».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— А што гэта ў цябе за чырвоная пляма на левым плячы?**

**— Ды глупства, проста я адляжаў.**

**— А што за цікавая наколка на правым?**

**— А гэта я адсядзеў.**

— Як дурніца можа каштаваць цэлых 50 рублёў за кг?

— Магчыма, яе вельмі цяжка збіраць?

— Ды для такой цаны яна павінна ўцякаць і адстрэльвацца!

**Я так ненавіджу панядзелкі, што вырашыў пайсці з офіса на фрыланс. Цяпер я аднолькава ненавіджу ўсе дні тыдня.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10 771. Індэкс 63850. Зак. № 2604.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 лістапада 2024 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12